Кагу 'стычная партыя (Кагыэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 265 (5058)
ЛІСТАПАДА
27
АЎТОРАК
1934 г.
год выдання XVI

Пролетарыі ўсіх краін, аднаўчайцеся!

ПІСЬМО тав. ВАРАШЫЛАВА УДАРНІКАМ СТАЛІНГРАДСКАГА ЗАВОДА „КРАСНЫЙ ОКТЯБРЬ"

Атрымаў ваша вельмі добрае пісьмо, вялікае вам, дарагія таварышы, дзякуй!

За кожным словам вашым успамінаю тых рабочых, якія душой гарэлі за свой завод, ненавідзелі гультаёў і прагульшчыкаў, гатовы былі усё зрабіць, каб выцягнуць завод з ганебнага прарыву, але, пазбаўленыя правільнага кіраўніцтва, не знаходзілі шляхоў да гэтага.

Калі я прыпамінаю свой прыезд да вас два гады таму назад, міжвольна напрошваецца параўнанне вашага пролетарскага калектыва тады з першымі партызанскімі атрадамі нашай рэволюцыі: цудоўны, у вогуле, народ, але нямала і усякай дзяні, прымазаўшайся да пролетарскай справы, і амаль поўная адсутнасць неабходнага кіраўніцтва, моцнага большэвіцкага камандавання. Такімі былі шмат якія партызанскія атрады першага перыяду, такі быў ваш завод два гады таму назад.

З радасцю за вас усіх чытаю я цяпер хвалюючыя лічбы вашых поспехаў. Так, вы заслужылі па праву сцяг нашай «Праўды». Я не сумняваюся, што вы і ў далейшым будзеце добра працаваць. Але, таварышы, гэтага цяпер ужо мала. Не забывайце, што і іншыя заводы працуюць добра. У вялікім спаборніцтве з імі вы пераможаце толькі тады, калі будзеце працаваць выдатна. Правяваць не прыбягаючы да штурмоўшчыны ў апошнія дні месяца ці квартала, а сістэматычна, з месяца ў месяц, з дня ў дзень перавыконваючы план так, як вучыць нас працаваць наша партыя.

Поўнага поспеху ў гэтым, дарагія сябры.

К. ВАРАШЫЛАЎ.

21 лістапада 1934 г.

„ЧАПАЕЎ"

«Яго імя ўвойдзе ў гісторыю грамадзянскай вайны бліскучай зоркай. І ёсць за што. Такіх як ён не шмат было».

Так пісаў пра легендарнага Чапаева яго баявы друг і саратнік — камісар Фурманаў.

Жалезнымі абцугамі, з поўдня і поўначы, усхода і захада безліч чорных воранаў, узброеных і абмундзіраваных сусветнай буржуазіяй, націскалі на маладую, неўмацаваную яшчэ рэспубліку Саветаў. Рабочы клас і працоўнае сялянства лепшых сваіх прадстаўнікоў пасылалі на перадавыя пазіцыі рэволюцыйнай барацьбы. Раслі і выхоўваліся, загартоўваліся рэволюцыйныя байцы. Барацьба нарадзіла герояў, сапраўдных народных герояў, акружаных любоўю і славай.

Гераізм, адвага, бясстрашнасць, адданасць справе рэволюцыі, рашучасць, сапраўдная любоў да народу — усё гэта спалучалася ў Чапаеве, зрабіла яго легендарным героем паўстаўшага народу.

Яго воля да перамогі захапляла другіх. Ён быў правадыром, натхняў, палаваў балёрасць. У асабістай адвазе і бясстрашнасці чапаеўцаў, у іх рашчоўным і руйнавальным нападзе на ворага выяўлялася несакрушальная моц рэволюцыйнай арміі.

І веліч фільма «Чапаеў», зробленага братамі Васільевымі, заключаецца, галоўным чынам, у тым, што ён, дасягаючы вялікай вышыні драматызму і ўнутранога пафасу, вяртае нас назад, да тых гераічных дзён, калі пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна мільёны галодных пролетарыяў і абкіданых сялян заваёўвалі магчымасць будаваць новае жыццё на зямлі. Веліч гэтага фільма і ў тым, што ён адначасова ў памяці недалёкіх дні крывавай барацьбы, што ён паказвае нашай моладзі, якім адважным, смелым і храбрым павінен быць баец за новае жыццё.

«Чапаеў» — гэта жывая старонка гісторыі рэволюцыі, жывая гісторыя падзей, яшчэ свежых у памяці іх удзельнікаў.

Кожны кадр гэтага, на дзіва простага і пераканаўчага фільма захапляе глядача, прыкуўае яго да сябе, хвалюе яго вобразамі чапаеўскага гераізма і фурманаўскай жалезнай вытрымаласці. Ён паказвае арганізуючую ролю партыі, вялікую мудрасць яе тактыкі, шляхоў, якімі яна накіроўвала і вяла волю мас да перамогі.

«Чапаеў» — гэта яркі, праўдзівы паказ перажытага і завяваванага пролетарскай рэволюцыяй. «Чапаеў» — гэта жывая паэма аб нашай юнасці, аб трушчасцях і складанасці класавай барацьбы ў часы грамадзянскай вайны, і гэта паэма вельмі навучальна для ўсіх тых, хто нарадзіўся, рос і фармаваўся ў гады ўжо мінулага соцыялістычнага будаўніцтва.

Мільёны людзей ужо глядзелі «Чапаева» з экрана. «Чапаеў» рушыўся ў трыумфальны паход па ўсяму Савецкаму Саюзу. Другі дзень глядзяць гэты фільм працоўныя Менска. Аб чым гавораць яны ў сваіх уражаннях?

Загартаваныя барацьбітыя, удзельнікі грамадзянскай вайны пішуць, што фільм натхняе іх на далейшае геройства на славу нашай непераможнай радзіме. Моладзь кажа: — Хочацца быць такімі, як Чапаеў, каб у патрэбную хвіліну аддаць усе сілы, а калі патрэбуецца — і жыццё на абарону нашай соцыялістычнай радзімы.

Падобна да таго, як 15 год таму назад імя Чапаева было сімвалам легендарнага геройства, адвагі і рашучасці, так і зараз фільм «Чапаеў» кліча да адвагі і геройства на франтах соцыялістычнага будаўніцтва.

Якое глыбокае незабыўнае ўражанне пакідаюць кадры фільма, калі Чапаеў марыць аб тым, што вось скончыцца вайна і «мы пабудуем такое жыццё, што памірацца не захочацца». Не дажыў Чапаеў да тых дзён, калі слава і гонар нашай краіны гулкім набатам гучаць па ўсяму свету. Да тых дзён дажылі яго дзеці — слухач Акадэміі механізацыі і матарызацыі РСЧА Алексанцр, чырвоны пілот Аркадзі, дачка Клаўдзія. За іх, і за шчасце соцень тысяч падобных да іх загінуў Чапаеў. Яны — сучаснае пакаленне совецкай моладзі — самае шчаслівае з усіх існаваўшых і існуючых. У яго — гераічнае сёння і дзівоснае заўтра.

Навісае непасрэдная пагроза новай імперыялістычнай вайны, лёза якой будзе накіравана ў першую чаргу супроць Саюза Саветаў, за шчасце і росквіт якога таварыў свае легендарныя цуды Чапаеў.

Аб гэтым, аб гэтай пагрозе нам напамінае з экрана жывы і неўмірушчы Чапаеў.

Які вялікі кантраст паміж слабасцю ўзброенай Чырвонай арміяй 1919 года, якая біла Калчака, Дзенікіна, Юдзеніча, белапалякаў, Врангеля і сучаснай Чырвонай Арміяй, якая аснашчана перадавой тэхнікай, выхавана партыяй у духу лепшых баявых традыцый, у духу гераізма і адвагі. Які вялікі кантраст паміж адзіным кулямётам у руках Анкі, Пеўкі і Чапаева і магутнай тэхнікай, якая дазваляе нашым лётчыкам выратаваць чалюскінцаў і лятець 12 тысяч кілометраў без пасадкі.

Гэтыя рэзкія кантрасты мімаволі пакутуюць у вашай памяці, бачачы гэты фільм вялікага і мужнага мастацтва.

У бліжэйшыя дні «Чапаеў» пойдзе на другія, агучаныя экраны БССР. Як толькі будуць гатовы яны, мы варыянты фільма, ён пойдзе на ўсе раёны, палітаддзелы, калгасы. Абавязак нашых партыйных арганізацый дабіцца, каб гэты фільм глядзелі ўсе; каб праўда аб нашай барацьбе стала здабыткам усіх.

«Чапаевым» партыя апрымала новы і магутны сродак класавага выхавання. Нянавісць да ворага, спалучаная з бязмежнай любоўю да памяці загінуўшых герояў, нанавіна глядача. Суровая мужная эпоха паўстае на экране. У залу даносіцца яе жорсткі і гарачы подых. Паўстаюць жалезныя людзі, прайшоўшыя жалезны шлях ад лепшых баёў за рэволюцыю да легендарных герояў на франтах будаўніцтва соцыялізма.

— Будзем такімі як яны, — вось з чым пакідае глядач залу кіно, уносячы з сабой жалезную рашучасць яшчэ больш услаўіць штодзённай барацьбой нашу соцыялістычную радзіму.

ГАЗЕТА-БАЕЦ

Загад Народнага Камісара Абароны Саюза ССР

25 ЛІСТАПАДА 1934 г. г. МАСКВА

I.

Вітаю работнікаў рэдакцыі, ваенкораў і чытачоў баявой чырвонаармейскай газеты Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі «Красный кавалерыст» з 15-цігадовым юбілеем газеты.

Работа газеты ў гады грамадзянскай вайны непарыўна звязана з паходамі і перамогамі першай конной арміі. «Красный кавалерыст» па свайму большэвіцкаму, баявому духу, па сваіх моцных сувязях з масамі чырвонаармейцаў быў газетай, дастойнай гераічнай чырвонай конніцы.

У гады мірнай вучобы газета была і застаецца бліскучым памочнікам камандавання і партыйных арганізацый часцей акругі ў іх рабоце па выхаванню кожнага байца, як актыўнага і свядомага будаўніка соцыялізма, беззаветна адданага сваёй радзіме, заўсёды гатовага грудзьмі абараняць яе гонар і недатыкальнасць яе граніц.

Жадаю работнікам рэдакцыі і ваенкорам газеты новых поспехаў у іх рабоце па ўзмацненню магутнасці Чырвонай арміі.

II.

Аб'яўляю падзяку і ўзнагароджваю каштоўнымі падарункамі работнікаў «Красного кавалериста»:

Рэдактара газеты т. Івангародскага—за ўмелае кіраўніцтва газетай;

Супрацоўніка газеты т. Аралава;

Супрацоўніка газеты т. Міронікава—за паспяховую і плённую работу ў газеце;

Старэйшага наборшчыка газеты, які працуе ў ёй з 1920 года—тав. Лютэнка;

Метранпажа газеты, які працуе ў ёй з 1920 года,—т. Агапкіна.

Народны камісар абароны Саюза ССР К. ВАРАШЫЛАЎ.

ЦК ВКП(б) з жалем паведамляе аб смерці старога члена большэвіцкай партыі, арганізатара працоўных жанчын і нястомнага барацьбіта за комунізм т. СМІДОВІЧ СОФІІ НІКАЛАЕЎНЫ.

ЦК ВКП(б).

ВЫСОКАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ АКТЫЎНАСЦЮ, КАНКРЭТНЫМІ ДЗЕЛАВЫМІ ПРАПАНОВАМІ АДЗНАЧАЮЦЬ ПРОЛЕТАРЫІ БССР ПЕРШЫЯ ДНІ ВЫБАРАЎ У ГОРСОВЕТЫ



На перавыбарчым сходзе ў Дзяржаўным яўрэйскім тэатры.

Друкары выбралі таварыша Сталіна сваім ганаровым дэпутатам

Сабралася ў будынку яўрэйскага дзяржаўнага тэатра БССР 600 рабочых друкарні імя Сталіна.

Тав. **Гераўкер**, ад імя гарадской выбарчай камісіі, абвяшчае сход адкрытым. Зала напружана слухае кожнае слова наказу. Адзін за другім выступаюць рабочыя работніцы тт. **Цёмкін, Загорскі, Ідэльсон, Левіт, Верамейчык, Рубінштэйн** і іншыя. Да наказу дадаюцца патрабаванні.

— Закончыць у першым паўгоддзі Дом друку. Друкарні імя Сталіна ўзяць на буксір адстаючую абойную фабрыку, вывесці яе з прарыву.

— Пабудаваць на Камароўцы лазню і кінотэатр.

— Папоўніць пушкінскую бібліятэку дзіцячай літаратурай

— Прывесці ў парадак гарадскі сад.

— Устанавіць кантроль за якасцю рамонту кватэр.

— Адкрыць зімовы дом адпачынку для ўдарнікаў.

Работніцы праяўляюць больш усяго клопатаў аб дзецях, аб іх будучым. Яны патрабуюць узорнай работы дзіцячых яслей, арганізацыі пры жактах дзіцячых куткоў для школьнікаў.

На чырвоным палотнішчы ў святле электралямпі запальваецца плакат: **«Лепшых ударнікаў у советы»**—тых, хто аддан будаўніцтву соцыялізма, хто паказвае прыклад барацьбы за яго перамогу.

Сталінцы выбралі ў горсовет:

Тав. **Гераўкера**, адказнага сакратара ЦСПСБ; тав. **Казлоўскага**—сакратара парткома, былога рабочага-чыгуначніка; **Дэрашэвіча** — старога рабочага-наборшчыка з 30-гадовым вытворчым стажам, лепшага ўдарніка-зотаўца; **Загорскага**—работніка ФЗВ друкароў, вылучэнца фабрыкі; **Скалазубаву**—брыгадзіра комсамольскай брыгады набornага цэха, комсамольку-ўдарніцу, упершыню выбіраючую ў совет. Кандыдатамі выбраны работніца **Гольдфарб** і рабочы **Матусаў**. Громкімі апладысментамі сустрэлі сталінцы прапанову выбраць членам горсовета т. **Галадзеда**.

Аднадушна правялі рабочыя сваіх дэпутатаў у органы дзяржаўнага кіраўніцтва.

І раптоўна бура апладысментаў вырасла з надзвычайнай сілай. Рабочы тав. Ізакаў прапанаваў выбраць ганаровым членам Менскага горсовета таварыша **Сталіна**. Доўга-доўга не змаўкалі прывітаньні па адрасу правадыра сусветнага пролетарыята.

Вечар закончыўся пастаноўчай прэм'еры яўрэйскага дзяржтэатра «Забастоўка жыццё».

Н. Г.

Тав. ГІКАЛО—ДЭПУТАТ МАГІЛЕЎСКАГА ГОРСОВЕТА

МАГІЛЕЎ, 25. (БелТА). На ўсіх прадпрыемствах горада перавыбары совецтваў цесна спалучаюцца з барацьбой за выкананне прамфінплана. Шаўковая фабрыка за апошнія дні выпусціла 94 проц. шоўку першага і другога гатунка. Такіх-жа поспехаў дабіліся і іншыя прадпрыемствы.

Актыўна праходзяць выбарчыя сходы. 21 лістапада на выбарчы сход дзённай змены шаўковай фабрыкі з'явілася 202 чалавекі (павінна было быць 203). Першым дэпутатам у склад горсовета выбраны **Гур'янаў** — малады інжынер, лепшы ўдарнік. Далей выбраецца работніца - зотаўка мятальнага цэха, якая працуе без браку, т. **Клімовіч**.

Гучнымі воплескамі сустрэлі прадзільшчыкі прапанову аб выбранні дэпутатам магілеўскага горсовета ад рабочых шаўковай фабрыкі першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Гікало**.

Яўка на выбарчыя сходы на чыгунцы складае 95-96 проц. Галоўныя пункты наказу, якія высоўваюць чыгуначнікі, гэта: арганізацыя транспартнай секцыі пры горсовеце, забеспячэнне поўнага выканання плана пагрузкі, своечасовая нывазка грузаў з таварнага двара.

ДОМБАЛЕЎЦАМ ЧЫРВАНЕЦЬ НЕ ПРЫХОДЗІЦЦА

БАРЫСАЎ. (Карэспандэнт «Звязды»).

Роўна ў 19 гадзін сакратар парткома завода імя **Домбаля** тав. **Кавальчук** адкрыў справаздачны сход.

— На сход, — заявіў ён, — з'явілася 598 выбаршчыкаў. Не прышло 2 чалавекі па ўважлівых прычынах. Сярэдні процант яўкі—**99,5 проц.**

Домбалеўцы прышлі даць ацэнку работы свайго горсовета, як ён выканаў пролетарскі наказ, расказаць аб тым, як рабочыя ля варштата змагаліся за ажыццяўленне гэтага наказу. А домбалеўцам чырванець не прыходзіцца. 10-месячны промфінплан бягучага года выкананы на 106 проц. Якасць высокая. Завод атрымлівае не толькі ад совецкіх спажыўцоў, але і ад замежных самыя лепшыя водзугі.

Гандлёвы персідскі дом «Мамед-Гусень Рахім Заде» праз совецкае торгпрэдстаўніцтва ў Персіі прыслаў наступную рэкламацыю: **«Прадукцыя завода імя Домбаля заслугоўвае ўвагі і поўнасцю забяспечвае патрэбы кліентуры. Выносім падзяку і адначасова просім, каб у далейшым нам дасылалася прадукцыя завода імя Домбаля».**

П. ЧЫКУН.

ВЫБРАЛІ ЛЕПШЫХ

ВІЦЕБСК, 25 (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

З выключнай актыўнасцю прайшоў выбарчы сход рабочых першай змены палчопна - трыкатажнай фабрыкі імя Клары Цэткін, на які арганізавана з'явіліся 875 рабочых (павінна было з'явіцца 881). Да праекту новага наказу выбаршчыкі ўнеслі 60 новых прапаноў. У склад горсовета выбраны дырэктар фабрыкі тав. **Хакіна**, лепшыя ўдарніцы тт. **Стэпсон, Ідэль** і іншыя. Адначасова ў склад горсовета работніцы выбралі сакратара гарадскога камітэта партыі тав. **Жураўлёва**.

Выбарчы сход ільнопрадзільшчыц змены «Б» фабрыкі «Дзвіна» таксама характарызуецца вялікай актыўнасцю ў абмеркаванні праекта новага наказу, яго дапоўнілі радам новых патрабаванняў, якга: адкрыць у Пролетарскай Слабадзе кінотэатр, хутчэй скончыць пабудову водаправода, пракласці асфальтавыя тратуары ад фабрыкі да клуба і інш. Работніцы змены выбралі ў склад горсовета лепшых ударніц фабрыкі тт. **Разумоўскую, Сінаўскую** і іншых.

На выбарчы сход горсовета паехаў першай змены лесазыўда імя «Праўды» пазначна было з'явіцца 333 чал., з'явілася 327 — 98,4 проц. Тут новы наказ горсовету быў таксама дапоўнены радам дадатковых пунктаў. Выбаршчыкі патрабавалі ад горсовета пабудаваць у Пролетарскай Слабадзе, дзе сканцэнтравана вялікая колькасць фабрык і заводаў — фабрыку-кухню і рабочае кафэ, арганізаваць стартыўную пляцоўку і замасціць вуліцу Бебеля. Усяго ўнесена 65 новых прапаноў. Членам горсовета выбрана лепшая ўдарніца завода тав. **ЛАБАНАСА**.

А. З.

ЗАВОД, ЯКІ УПЕРШЫНЮ СЛУХАЕ СПРАВАЗДАЧУ

ГОМЕЛЬ, 25. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Заводскі пасёлак увесь заліт яркім электрычным святлом.

Гукі аркестра чутны далёка-далёка за пасёлкам.

Каля тысячы рабочых шклозавода сабраліся ў заводскую сталовую на справаздачны сход Гомельскага горсовета.

Старшыня заўкома тав. **Клімовіч** прадастаўляе слова дакладчыку, нам. сакратара гаркома тав. **Клімчуку**.

Дакладчык, па-першае, дае даведку, што Гомельскі горсовет наогул упершыню робіць справаздачу на заводзе. У 1931 годзе на месцы, дзе зараз знаходзіцца каля трох тысяч выбаршчыкаў, тады быў пустыр і толькі намячаліся яшчэ контуры будучага шклозавода-гіганта.

Тав. Клімчук асобна спыняецца на нездавальняючай рабоце горсовета па кіраўніцтву прамысловасцю; нечастатковую ўвагу аддаваў горсовет і рабоце шклозавода.

Пасля даклада пачаліся выступленні рабочых. Асабліва скарджаліся выбаршчыкі на дрэнную медыцынскую дапамогу. Нават зубнога ўрача горсовет не змог прыслаць у заводскую амбулаторыю і прыходзіцца ехаць, а часцей нават ісці пехатой у горад за 15 кілометраў. Шасе не абрамантавана. З-за дрэнных дарог ламаюцца заводскія машыны.

Тав. Карнееў гаворыць аб тым, што прадстаўнік горсовета ні разу не бываў на заводзе, не дапамагаў яму ў рабоце. Тав. **Скуратовіч** спыняецца на рабоце заводскай школы, якая дрэнна забяспечана падручнікамі.

Выступаючыя ў спрэчках высунулі прапанову аб арганізацыі пасялковага совета.

Вытворчы паход імя з'езда советаў выклікаў новы ўзлым энтузіязму. Калі за кастрычнік завод выканаў промфінплан на 97 проц., то за першыя дзе дэкады лістапада праграма выканана на 111 проц.

ПАЛЯШЧУК.

АПРАЎДАЎ ГОДНАСЦЬ ЧЛЕНА ЦВК

ПЕТРЫКАЎ.

Хто не ведае ў Аносавічах старога 70-гадовага **Кобешава**—лепшага ўдарніка-калгасніка, члена ЦВК БССР.

Цяжка ўтнацца за ім маладым калгаснікам. Усюды на любым участку: на ворыве, на малацьбе стары **Кобешаў** ідзе ўперадзе. Асабліва ўдарную работу паказаў ён пры апрацоўцы ільновалакна. Дзень і ноч дзяжурыў ён каля печы ў сушні; выпрацоўваў па 3-4 нормы.

Калгас імя Молатава, дзе працуе тав. Кобешаў, першым па сельсавету выканаў план здачы ільновалакна. У дзень 17-й гадавіны Окцябра Новаселькаўскі сельсавет прэміраваў тав. **Кобешава. Тав.** Кобешаў паставіна дапамагае сельсавету ў выкананні ўсіх распадарча-палітычных кампаній. Ён карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод калгаснікаў і аднасобнікаў.

Тав. Кобешаў апраўдаў гаворнае званне члена ЦВК БССР.

МАХЛАЙ М.

За баявое адзінства французскага пролетарыята

ЗВАРОТ ПАЛІТБЮРО ФРАНЦУЗСКАЙ КОМПАРТЫІ ДА КІРАЎНІЦТВА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ

ПАРЫЖ, 25 лістапада. (БЕЛТА). Учора ў Парыжы адкрыўся пленум нацыянальнага совета французскай соцыялістычнай партыі. У парадку дня—рэзультаты адзінства дзеянняў.

На ўчарашнім пленуме ў Парыжы пачалася дыскусія аб прадвыбарчай тактыцы, якую праба будзе праводзіць у 1935 годзе на муніцыпальных выбарах. Пры гэтым выявіліся тры тэндэнцыі:

1) за агульныя спісы з комуністамі ў першым туры;

2) за соцыялістычныя спісы ў першым туры і сумесныя з комуністамі ў другім;

3) за агульныя спісы з радыкаламі ў «спецыяльных выпадках», асабліва ў сельскагаспадарчых акругах.

Палітбюро компартыі звярнулася ў нацыянальны совет соцыялістычнай партыі з пісьмом, у якім падкрэслівае велізарныя вынікі, дасягнутыя адзіным фронтам, які прымусіў адступіць фашызм і звярнуў Думерга. З другога боку, палітбюро адзначае слабыя месцы пагалення, у першую чаргу тое, што яно не датычыць пытання аб забастоўках у абарону рабочых патрабаванняў.

У заключэнне пісьмо выкладае комуністычную праграму патрабаванняў. Праграма змяшчае патрабаванні чыгуначнікаў, дзяржаўных служачых, беспрацоўных, сялян, дробных гандляроў, рамеснікаў, кватэранаймальнікаў, былых франтавікоў салдат. Комуністычная праграма прапануе змагацца за адмену надзвычайных дэкрэтаў і падатковай рэформы, прынятай у 1934 годзе, за арганізацыю буйных агульнакарысных работ, за разбурэнне фашысцкіх ліг, за прапарцыянальнае прадстаўніцтва, за ўсеагульнае разбраенне на аснове, выпрацаванай СССР і т. д.

Палітбюро выражае жаль па поваду рашэнняў II інтэрнацыянала, які адмовіўся ад міжнароднага адзінства дзеянняў у абарону іспанскай рэволюцыі і заклікае соцыялістычных рабочых умацаваць адзінства дзеянняў і змагацца за адзіны прафсаюзны фронт.

КАТАРЖНЫЯ ПРЫГАВОРЫ У ГЕРМАНІІ

БЕРЛІН, 26.XI (БЕЛТА). Так званы «народны суд» у Берліне вынес абвінаваўчы прыгавор былому члену комфракцыі рэйхстага Эрнсту Буцэ і двум яго таварышам па падзарэнні, што яны з'яўляюцца арганізатарамі падпольнага чырвонага прафсаюза. На судзе Буцэ адкрыта заявіў, што свядома працаваў для перамогі компартыі ў Германіі. Суд прыгаварыў Буцэ к 3-м гадам катаргі. Двое астатніх абвінавачаных прысуджаны да 1,5 гадам турмы.

РАБСТВА У ПОЛЬШЧЫ

ЛОНДАН, 25. (БЕЛТА). Варшаўскі карэспандэнт «Дэйлі экспрэс» паведамляе, што каля Вільно паміраючыя ад голаду бацькі сяляне, маючыя 5 дзяцей, прадалі кулаку свайго 11-гадовага сына Пятра Піткевіча. Бацькі атрымалі за дзіця 150 кілограмаў збожжа, фурманку бульбы і нязначную суму грошай.

Карэспандэнт указвае, што продаж дзяцей галадаючымі сялянамі ў паўночных раёнах Польшчы прымае шырокія размеры.

ЭКСПЕДЫЦЫЯ БЭРДА У ЦЖЧІМ СТАРОВІШЧЫ

ЛОНДАН, 25.XI (БЕЛТА). Нью-Іоркскі карэспандэнт «Дэйлі Геральд» паведамляе, што частка экспедыцыі адмірала Бэрда на паўднёвым полюсе, пасланая з галоўнай базы экспедыцыі на далейшыя вышуканні, трапіла ў цяжкое становішча. Партыя, якая рухаецца на трактарах, упершыню ужываемых у арктычных экспедыцыях, трапіла ў раён, у якім шмат вялізных трэшчын і не можа прасоўвацца далей.

ПРАДАЎЖАЮЧЫЯСЯ НАСІЛЬНЫЯ ДЗЕЯННІ ЯПОНСКАГА ВАЕННАГА КАМАНДАВАННЯ НА КУЧ

ХАБАРАЎСК, 24 лістапада. (БЕЛТА). 18 лістапада на дарозе ў Харбін пры спробе прайсці ў вагон-сталовую праз вагон III класа, заняты японскай вайсковай аховай былі збіты японскімі ваеннымі чынамі пасажыркі **Рабоконь**—грамадзянка СССР і **Маяр**—швейцарская грамадзянка.

Пры тых-жа абставінах быў збіт малодшы кандуктар грамадзянін СССР Кадзет.

Захват японскімі ваеннымі чынамі чыгуначных памяшканняў прадаўжаецца. 19 лістапада на ст. Шуанчэну 4 узброеныя японскія чыны заняілі кватэру вагаўшчыка **Обрэскава**, выкінуўшы яго рэчы на вуліцу. 18 лістапада на ст. Пагранічная японскія паліцэйскія выселілі з кватэры дзесятніка службы пуці **Дзем'яненка**. Таго-ж чысла японскімі ваеннымі чынамі самавольна заняты тры кватэры чыгуначных служачых. Захвачаны таксама кватэры начальніка 9-га ўчастка пуці і пам. загадчыка камерцыйнага агенцтва ў Пагранічная, якія знаходзяцца пад арыштам. Гэтыя кватэры будуць, як відаць, прадастаўлены японскім чыгуначам.

16 лістапада з гарбарнага завода КУЧ, не гледзячы на пратэсты адміністрацыі, японскімі салдатамі, якія з'явіліся на завод, пад кіраўніцтвам японскага афіцэра былі вынесены матэрыялы і інвентар завода, а служачыя і рабочыя, што пражывалі на гэтым заводзе, былі выселены. У мэтах прыняцця мер па выратаванню маемасці і выяўлення страт была складзена камісія з прадстаўнікоў дарогі з удзелам кантролю і чыгуначнай паліцыі, якая аднак японскам камандаваннем не была дапушчана на завод, з-за чаго не магла выканаць усклаўдзеных на яе заданняў.

Па гэтаму поваду кіраўнік КУЧ т. Руды звярнуўся з пісьмом да начальніка японскай ваеннай місіі, катэгарычна пратэстуючы супроць насільных дзеянняў японскага ваеннага камандавання. Разам з тым тав. Руды заявіў, што ўсе страты, прычыненыя гэтымі насільнымі дзеяннямі японскага камандавання, будуць аднесены за кошт апошняга.

29 ЛІСТАПАДА Ў 9 ГАДЗІН ВЕЧАРА ЦК КП(б)Б ПРАВОДЗІЦЬ **УСЕБЕЛАРУСКУЮ РАДЫЕПЕРАКЛІЧКУ** НА ПЫТАННЯХ ПАДРЫХТОЎКІ ЖЫВЕЛЫ ДА ЗІМОЎКІ. УЛІКУ ПЛЕМІННОЙ ЖЫВЕЛЫ, ЗАСЫПКІ НАСЕННЯ І РАЗМЕРКАВАННЯ ДАХОДАЎ У КАЛГАСАХ.

НА ПЕРАКЛІЧКУ ВЫКЛІКАЮЦЦА САКРАТАРЫ РК КП(б)Б, СТАРШЫНІ РВК, ДЫРЭКТАРЫ І НАЧ. ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ МТС, ЗАГ. РАЙЗА І РЭДАКТАРЫ РАЙГАЗЕТ.

ЦК КП(б)Б.

Віцебск зотаўскі

ТЭХНІКА В ПЕРИОД РЕКОНСТРУКЦИИ ДЕШЕВ ВСЕ — ЗОТ

„ИСПОЛНЕНИЕ ЖЕЛАНИЙ"

Тэхніка ў перыяд рэканструкцыі вырашае ўсё. Гэту сталінскую запаведзь мы бачылі ў Віцебску ў тысячах варыянтаў. У гэтым горадзе значок «ЗОТ» носіць сакратар гаркома і качагар паравоза ЭУ—708/17. У гэтым горадзе значок «ЗОТ» у тысячах экземпляраў разносіць у загалоўку газета. Гэты значок разам з ордэнам Леніна носіць тут Надзя Асташка. Тут жывуць зотаўскія сем'і, тут працуюць зотаўскія брыгады і цэхі. 3.000 чалавек носяць значок «ЗОТ», 9.000 рыхтуюцца атрымаць яго. Гэта зотаўскі горад.

Тэхніка ў перыяд рэканструкцыі вырашае ўсё, але вялікае значэнне тэхнікі смутна разумеў і былы гаспадары горада. Недарма ўпраўляючы «Ліпера дэ Вітэбск» Дэзіра Аўгуставіч Тфельт пісаў па-французску віцебскаму губернатару:

«Считаю своим долгом довести до сведения вашего превосходительства об общем состоянии фабрики. За четыре года ее эксплоатации она имеет 268.102 руб. убытка. Этот убыток получился благодаря затруднениям, которые имела фабрика по составлению рабочего персонала».

У гентскіх капіталістаў не было «выдатнікаў», у іх, гаворачы сучасной мовай, быў глыбокі прарыў. Першы «тэхнічны экзамен» быў у металазаводчыка Грынбера. Калі прымалі на работу, малатабоец стукаў па кавадлу, гаспадар кляжеў і моршчыўся — гэта на саракоўку!..

Малатабоец біў з усіх сіл — а вось гэта на паўрубелі!... — усміхаўся гаспадар, — бі так!.. Але тэхніка ў Віцебску была мізэрнай. Заводчык Зельч раздаваў на дом драўляныя варштаты, на якіх уся сям'я шліфавала шкло. Можна было калыхаць дзіця і нагой рухаць варштат. Але ў пакоі ад пылу стаяў туман. Тэхніка Віцебска ўвекавечана карцінамі мастака Пена. Гэта тэхніка вясельных яўрэйскіх піраў, жалкая тэхніка суботніх свечак і маленькіх пакойчыкаў гадзінчыкаў. Працы «па тэхніцы» вычэрпваліся статутам віцебскага «благородного общества».

«Дэ-журный непременно открывает бал в одинадцать часов польским вальсом. Затем надлежит танцевать французскую кадриль, мазурку и в заключение котильон».

Мы не ведаем, як думаў пасадзіць тэхніку Тфельт. Але нам добра відома, што з яго спроб нічога не выйшла. Затое другія думкі і дзеі ўкладаліся поспехам.

Калі жалобны поезд вёз цела Леніна з Горак, на паравозе быў сакратар ячэйкі дэпо Масквы Баранаў. Тады ён перадумаў, аб чым можа думаць у такую трагічную мінуту большэвік, і там ён пакляўся. І зараз, будучы начальнікам паліграфдзела МВБ, ён убачыў выкананне клятвы, убачыў свет на шляху тэхнікі, уваходзячы ў комунізм, убачыў яго ў сям'і лепшага сігналіста, лепшай безаварыйнай змены станцыі Віцебск Івана Юр'евіча Азола, жонка якога арганізавала паход жонак чыгуначніка за безаварыйную работу станцыі.

Сакратнік Будзённага, чырвоны камандзір тав. Шубін, спякаючы крывёй, падаў з каня, не дасакаўшы да Віслы. Ён заслужыў тры баявыя ордэны. Ён таксама клаўся і таксама мёрыў аб чырвонай кавалерыі, аб арміі пролетарыята. Гэта прышло зараз да яго на Віцебскі іпадром у вобразе красаўца рысака «Грома», усесаюзнага рэкардыста па тэхніцы бегу. Шубін убачыў выказанне сваіх жаданняў у маладой тэхніцы, у віцебскім зоавеціністытуце, дзе маладыя аспіранты адкрылі трыпанаблю, магутны сродак лячэння коней. Таму з новым асаблівым гонарам носіць Шубін у зотаўскім горадзе свае тры ордэны.

Дажыў да радасных дзён і вадаправодчык Каплановіч. Сын яго вырашыў у цёмным куце віцебскіх падвалаў, атрымаў кафедру ў віцебскім політэхнікуме і стаў навуковым кансультантам Белэнерга. У памяшканні зоафака над кнігай сядзіць былы падпасак кулака Грыша на, студэнт IV курса Владзімір Сапега. Ён чытае Кювье, ён падымае над сталом адну косць калекцыі і бачыць усяго іхтыязаўра. Толькі ў адным месцы на зямлі батрак, лакоў згрыжалі магчымасць захапляцца вучэннем Кювье. Гэта магчыма ў той краіне, дзе сын віцебскага легкавога рамізніка Шаі Ліўшица з зотаўскага горада транліе проста ў супраноўнікі сакратарыята ВЦВК. У гэты горад на рускім возе ўязджае зараз старшыня калгаса імя Кантонскай комуны тав. Сі-Дау-дзі і лепшы брыгадзір калгаса тав. Лі Вун-лі. Яны вязуць на выстаўку кармовыя буракі вагой у 10 кіло і вядуць карову «Маргарыту», якая дае 18 літраў малака ў суткі. Яны гавораць аб кітайскіх советах і аб калгасе і слова «агразот»—шчаслівае слова — гучыць у іх вуснах як родное, кітайскае.

І яны праязджаюць па вуліцах Віцебска, на якіх бегаў яўрэйскі хлопчык Ёська Мінцлін. Ён упітваў у сябе вобразы яўрэйскай беднаты, пакорнасці і забітасці. Ён набіраўся народнага гора. І гэтыя ўражанні дзяцінства вырваліся потым у Мінцліна бурным талантам. Артыст Мінцлін стварыў вобраз Мотэле Шпіндлера, абышоўшы ўсе экраны свету, як пратест яўрэйскай беднаты супроць бяспраўя і ўціску.

Калі Гірш Лекерт забіў віцебскага губернатара, многія яўрэйскія юнакі з Віцебска марылі быць такімі, як Гірш Лекерт. Сірод іх быў худы хлопчык Моін. З таго часу яўрэйні галы. Віцебск стаў горадам зотаўскім, а Моін вучыўся і ўсё-ж такі дасягнуў выканання сваёй мары. У Віцебск прыехаў яўрэйскі тэатр. І на эшафот, пастаўлены на сцэну, узышоў прэм'ер тэатра Моін і сказаў у залу з палаючымі вачыма: — Я паміраю за вас!.. У зале плакалі. Гэта быў сапраўдны Гірш Лекерт.

Такія-ж слёзы задавальнення выступілі на вачах таварыша Маўса Гельца, калі ён аглядаў светлы як палац магутны корпус фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі».

— Так, вадта было за гэта змагацца — сказаў рабочым Мако Гельц, вязень Моабіта.

Тэхніка ў перыяд рэканструкцыі вырашае ўсё. Гэту запаведзь мы бачылі ў зотаўскім Віцебску ў тысячах варыянтаў. І тысяча людзей знайшлі ў гэтым горадзе выкананне сваіх заветных жаданняў. Ці можна не сумаваць аб гэтым горадзе?

Тав. ОСТАШКО, работніца фабрыкі «Дзвіна», узнагароджаная ордэнам Леніна

ЛЮДЗІ І РЭЧЫ

Далёка па краях і абласцях Саюза ідзе слава пра Віцебск. Далёка за межы Саюза нераможным маршам выходзяць рэчы, зробленыя ў Віцебску. Турэцкія сялане выходзяць на палі ў віцебскіх бацінках. Гэтымі бацінкамі прэміруюць лепшага калгасніка ў Рэвякіна. У пралёце вялікага канвеера Горкаўскага аўтазавода ходзяць ногі, абутыя ў гэтыя бацінкі. У далёкай Якуціі аленеводы адымаюць з сябе звярыныя скуры і з асалодай кранаюць мяккую тканіну віцебскай балізны. Смуглыя даяўчаты Джакоп носяць віцебскія панчохі. І калі мастак Марк Шагал захапляўся герэізмам совецкіх лётчыкаў, то няхай ён ведае: Молакаў глядзеў на халодную пустыню Арктыкі праз лётныя акі, зробленыя ў Віцебску. Няхай ён ведае, што на многіх стадыёнах Саюза маладыя целы апрануты ў майкі віцебскай фабрыкі «КІМ». І нават, калі сумуючы Марк Шагал захоча забыцца парыжскай рускай песенькай «Шансон дэ «Черные глаза», унылы джаз зашлача на кончыку патэфоннай іголкі а маркай «Made in СССР», віцебскай іголкі.

Дзіўныя людзі робяць гэтыя перамагаючыя свет рэчы. Вось машына сакратара гаркома спыняецца супроць хаты столяра Капланскага. Сакратар гаркома прыехаў на пленум зотаўскай сям'і. Тры дачкі, сын і жонка сына носяць значкі «ЗОТ». Сёння яны заключаюць спаборніцтва паміж сабой, гавораць пра тэхніку і пра шчасце. Такі звычайны дзень зотаўскай сям'і.

У гэтым горадзе нармальнае з'явішча, калі былы чорнарабочы 20-гадовы хлапец Віктар Біаўноў становіцца брыгадзірам завяршаючага працэсу апрацоўкі шчаціны і 114 старых рабочых слухаюцца яго ўказанняў. Тут нікога не здзіўляе, калі нямецкая фірма «Авто Загаранскі» прапануе рабочаму шчоткамбіната Гофману тысячы рублёў за яго машыну для апрацоўкі размельчанай шчаціны, якая замяняе 100 рабочых, за яго універсальную машыну для сартавання волаву, якая замяняе 80 рабочых, і за яго машыну для мыцця шчаціны. Але ўся фабрыка аддадзе Гофману, калі ён адказвае «Авто Загаранскаму»: Гэтыя машыны я стварыў у нашай краіне, мне дапамагала партыя і я аддаю іх краіне і партыі.

У гэтым горадзе такія ўжо звычай, што беспрытульніца, начаваўшая ў катлах Алена Норкіна, атрымлівае першы па ўсім горадзе значок «ЗОТ». Аб гэтай дзяўчыне з трыбуны з'езда партыі гаварыў Галадзед. Шлях ад беспрытульніцы да брыгадзіра сацыяльна-зотаўскай брыгады кецельшчыц—няўжо гэта не дзіўны шлях? Няўжо ён устуае шляху старога металіста Рыбіцкага, ўпешчанага 60 рацыяналізатарскіх прапаноў. На капіталы, з'якамленыя Рыбіцкім, можна набудаваць заводы. Няўжо ён менш слаўны, чым шлях старой работніцы Раманавай, якая доўгія годы пасвіла кароў на Маркаўшчыне і зараз вылучана майстрам сацыяльна-зотаўскага матальнага цэха фабрыкі «Дзвіна». Мець у сябе пад камандай 470 зотаўцаў у рад — гэтым за ўсім Саюзе пакуль што можа пахваліцца толькі адзін майстар Раманава! Так сама як адзін толькі каваль Сандлер можа пахваліцца ўсесаюзным рэкордам. У дні першай пяцігодкі ён даваў на штампе штодзённа 4.000 лемяхоў. Лемяхі закрывалі яго сцяной ад цэха.

Рабочы тав. ГОФМАН рацыяналізатар шчаціна-шчотачнай фабрыкі

Гэтыя дзіўныя людзі слалі адкрылі сакрэт работы маўклівага нямецкага кансультанта Вінтэра. І Вінтэру прышлося пакінуць акулярную фабрыку. Зараз танчэйшыя фіцу — механізмы пенсне, за якія возьмецца не кожны гадзіннічык, масавымі партыямі выпускае цэх пад кіраўніцтвам тэхніка Арша. Гэтыя людзі акружылі сябе машынамі, якіх не бачыў да гэтага часу Віцебск. Гігант струтальны варштат, маючы 4 метры ў хаду, стаіць у цэху «Чырвонага металіста». Тут выпускаюць магнітна - шліфавальны варштаты. Завод «Комунар» змантаваў табака-нарэзную машыну. Металісты Віцебска асвоілі выпуск тачыльнага варштата Т2М і свідравальнага СВ-2.

Ф-КА «СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» (Віцебск)

У тэатры, дзе некалі ў недарэчнай оперы «Ванька ключнік» абірала лаўры поспехаў Кісялёва, і губернатарскія сынкі пускалі ён на плечы галубоў з блакітнымі істужкамі на шыі, зотаўскі горад арганізуе чэшскіх пядынкі. Тут на арэне стары і малады каменшчык спаборнічаюць на хуткасць кладкі. Метад інерс ці рускі метад? На арэне растуць 2 сцяны пад адабраючыя воплескі залы. Чатыры тысячы чалавек, затаіўшы дыханне, сачылі за кожным рухам каменшчыкаў. У ложах сядзелі барадачы каменацесы і лепшыя людзі сямі цагельняў. Гэта яны змянілі твар Віцебска, пабудаваўшы на Маркаўшчыне, дзе, згодна прыказкі, быў манастыр і пустыр, сацыялістычны гарадок. І заўтра, калі хвалі вялікага Дняпр напоўняць рэчышча Дзвіны, калі на берагах не паўстане папяровацэлюлозны камбінат, яны будуць будаўнікамі горада з 250 тысячамі шчаслівых жыхароў, будаўнікамі будучага Віцебска.

ДЗЯРЗАЙЦЕ, ТАВАРЫШЫ!

Дзярзайце!.. Гэта лозунг талантлівых людзей сацыялістычнай бацькаўшчыны. І ў Віцебску дзярзаюць. Людзям мала гіганцкіх варштатаў, і рабочы Пржэвоцкі ўпарта думае над уласным варштатам для заточкі фрэзы. Кемсамольцу Раудо мала значка «ЗОТ», ён працуе над тэхнапромфінпланам брытады, ён за адзін дзень збірае ў брыгадзе 16 новых рацыяналізатарскіх прапаноў, ён дабіваецца ганаровага імя «тав. Раудо першы брыгады тэхнарук». Заводы пераходзяць на тэхнапромфінплан, заводы збіраюць тысячы ўнутраных рэсурсаў. Пяць заводаў працуюць ужо на тэхнапромфінплане. Ужо выйшлі з брытад актуізісты тэхнапромфінплана, такія людзі, як Марыя Самцова, работніца, расстрапаваўшая тэхнапромфінплан цэха, складаецца якога налохала інжынераў.

Мала таго, што выкрыты сакрэты кансультанта Вінтэра. Рабочы Пісманаў вынаходзіць ашчэ аўтамат, які шліфуе 1.100 спёкал у дзень. А Вінтэр шліфаваў 30. Жыццё так незвычайна, што людзям нават мала свят. І вось жонка паляка слесара Шіхаша і жонка яўрэя вадаправодчыка Добрамысліна арганізавалі святкаванне сумеснага юбілея двух старых кадравікоў. Жонкі запрасілі ў госці сакратара гаркома. І ў доме святкавалі выратаванне Добрамысліным заводскага нафтаправода і гадавіну вынаходак Шіхаша. Жыццё так незвычайна, што яно пасіпла на паперу. І стары слесар Шіхаш піша дзіўную аповесць на 22 друкаваных аркушы «Гісторыя майго жыцця». І з ім за сталом 18-гадовы сын, слесар, піша вершы ў цэхавую штодзенку.

Людзі дзярзаюць. Комсамольцы Люзженскі і Фрыдман пішуць тэхнічную брашуру аб шчаціне. Пасля гудка ў інтэрнат брыгады Норкінай прыязджае прафэсар і чытае даўчатам лекцыю па дыялектычнаму матэрыялізму. Лепшая зотаўка, брыгадзір фабрыкі «Дзвіна» тав. Соснер пасля работы спяшаецца на ўрок балета. На «Чырвоным металісце» слесары рысуюць дыпломныя праекты мацыц. Кацельшчыца фабрыкі імя Клары Цэткін Таня Воранава сама без пабочнай дапамогі прапрацоўвае ўжо другі том «Капітала». Калектыў работніц фабрыкі «КІМ», дзе кожная работніца ўпраўляе 14-цю аўтаматамі, выступіў з прапановай увесці «ЗОТ» другой ступені значок вышэйшай тэхнічнай граматнасці. Прапанова пахоплена з энтузіязмам. Людзі дзярзаюць. Людзі не затрымліваюцца на дасягнутым. Дзярзаць — гэта лозунг талантлівых людзей сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Барацьба за аўладанне тэхнікай, за гераізм працы пранікае ва ўсе куткі горада. У Віцебску ёсць «выдатнікі» абароны. Увесь гарнізон ведае вартавога Шкрадзюка, забіўшага дыверсанта каля паравозных складаў. У Віцебску ёсць героі — «выдатнікі» палёў. Увесь раён ведае трактарыста Еруданава, цэлую ноч працаваўшага на трактары, каб вымалаціць усё жыта і не пакінуць яго на полі. У Віцебску ёсць героі — «выдатнікі» аховы ўраджаю. Усім вядома імя калгасніка Шлюпакова, які адзін кінуўся на групу кулакоў, крыехаўшых красці калгасную бульбу. Ён ледзь не загінуў, але выратаваў калгаснае дабро.

І вось 3.000 «выдатнікаў» збіраюцца на гарадскую канферэнцыю. Сакратар гаркома партыі чытае тэлеграму сакратара ЦК КП(б)Б. **«ЦК КП(б)Б шле гарачае большэвіцкае прывітанне ўдарнікам віцебскіх прадпрыемстваў, сабраўшымся на абласнагарадской канферэнцыі зотаўцаў.** (І зала ўспамінае: ліцейны цэх «Чырвонага металіста». Тады не было коксу, не было ліцця, быў толькі антрацытавы кокс, і людзі рашылі пусціць яго ў вагранкі. Удушлівы дым паўзе па цэху, галава кружыцца, людзі падаюць, трацяць прытомнасць, іх выносяць, адліваюць вадой, і, адкрыўшы вочы, яны зноў варочаюцца ў цэх. Так быў адабыт патрэбны метал). **Віцебскі пролетарыят пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі дабіўся вялікіх поспехаў у рабоце па выкананню плана.** (Зала ўспамінае: зотавец Багданаў фармаваў за змену 300 штук дэталей складанага рэльба-рэзнага варштата «506». Зотавец Самсонаў спыніў паравоз ЭУ-708, калі ён на поўным ходу з пасажырскім поездам быў пушчан на заняту лінію). **Прамысловасць Віцебска за прайшоўшы адрэзак часу ідзе ўперадзе ўсіх іншых раёнаў і гарадоў Беларусі.** (Аднойчы, калі прарвала вагранку і ў вочка ўдарыла полымя расплаўленага метала, калі сэрцы спіснуліся ў прадчуванні выбуху, зотавец Саламонік падняўся і пад пырскамі расплаўленай сталі рукамі забіў агнеўпорам разарванае вочка. Вопратка на ім дымілася, ён стаяў у полымі, легендарны герой, але аварыі не было). **ЦК КП(б)Б спадзяецца, што ўдарнікі віцебскіх прадпрыемстваў прыкладуць усе сілы для дапейшага аўладання тэхнікай.** (Калі аднойчы адкрылася фарсунка лакамабіля, гарачая нафта ўдарыла ў дах цэха і языкі полымя пабеглі па сцяне. Начальнік цэха Фрумкін кінуўся да машыны і ў агні закруціў крант. Ён апёк руку да касці. ЦК партыі можа спадзявацца на такіх людзей). **Няхай жывуць ударнікі віцебскіх фабрык і заводаў!»**—чытае сакратар гаркома словы вышэйшай пахвалы сакратара ЦК КП(б)Б. Зала ўстае і рукаплешча т. Гікало.

Тав. НОРКІНА ЕЛЕНА, ф-ка «КІМ», лепшы брыгадзір.

Канферэнцыя канчаецца позна. Спыняюцца станкі заводаў. Віцебск засынае. Даўно заснула васьмігадовая Лідачка Падыгаева, атрымаўшая лепшы водгук на алімпіядзе БВА за танец Шаміля. Спіць будучая талантлівая балерына. Адкладзіў кісць мастак Ахрэмчык, які малюе ў Віцебску вялікае палатно «2-гі з'езд партыі». Рабочы завода «Чырвоны металіст», аўтар двух кніг вершаў паэт Браніслаў Лугоўскі канчае верш: «Горад мой, горад зотаўскі!..»

Спіць зотаўскі горад. У гэтым горадзе складаў свае песні кампазітар Бессмертны. У гэтым горадзе рысаваў свае карціны мастак Зевін, чыя карціна «Рабочая сям'я» выклікала захапленне ў Луначарскага і нарком паслаў мастака вучыцца заграніцу. У гэтым горадзе ствараў свае барэльефы буйнейшы скульптар Масквы Якірсон. У гэтым горадзе майстар Сіліч абдумваў свае партыі з Гансам Кмокам.

Зотаўскі горад спіць. І тады па прамому праводу сакратар ЦК КП(б)Б выклікае гарком. У ЦК не спяць. Там думаюць аб Віцебску, аб яго людзях, аб яго шчасці, аб яго будучыні. Над палямі гудуць правады, што моцна авязалі будынак ЦК партыі з гэтым залітым агнямі вялікім сацыялістычным горадам пад Давіной. І таму горда калышацца над будынкам Віцебскага гаркома чырвоны сцяг, які ўзняў на вышыню 22-х тысяч метраў радзіўшыся ў гэтым горадзе гераічны зотавец стратасферы Ілья Усыскін. Дзярзайце, таварышы, кліча гэты сцяг!..

Б. ПАСКАНЬЕЎ.

АДЧЫТВАЕЦЦА КЛІМАВІЦКІ РВК

КЛІМАВІЧЫ. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

15 лістапада першы пленум новага-выбранага Гусарскага сельсовета заслухаў справаздачны даклад аб рабоце райвыканкома.

Па дакладу разгарнуліся гарачыя спрэчкі. Усе выступаўшыя ў першую чаргу спыняліся на становішчы жывёлагадоўлі ў раёне. Райвыканком і сельсоветы не вялі большэвіцкай барацьбы па ўзьму жывёлагадоўлі. За апошні год у раёне нагадваецца змяншэнне паголоўя па ўсіх відах жывёлы. Паголоўе авечак напрыклад, зменшылася больш, чым у два разы. Лічбы гавораць аб недапушчальных адносінах да развіцця жывёлагадоўлі.

Ход калгасаў не выканалі дзяржаўнага плана ўкамплектавання стада.

Калгас імя Соўнаркома БССР, Кісель-Будзянскага сельсовета, укамплектаваў стада толькі на 49 проц. Калгас «Большэвік», Пуцілаўскага сельсовета, на 19 проц. Не ва ўсіх калгасах створаны новыя фермы. У цэлым радзе калгасаў рэбла не падрыхтавана жывёле цёплая і сытая зімоўка. Плана абкармлівання на раёну не выканан.

— Развіццё жывёлагадоўлі цесна звязана з падняццем ураджайнасці палёў, — гаворыць кандыдат у члены сельсовета **Андрэенка.**

— Але пра ўраджайнасць у нас больш балбочуць, чым робяць на справе. Атраном у калгасе — рэдкі росць. За паўтара года толькі два разы ён мелькам паказаўся ў нашым калгасе «Праўда». У калгасах паўсюдна парушаюцца севазвароты. А хіба мы можам дабіцца добрай ураджайнасці без севазваротаў.

— У раёне многа лугоў, — заўважае **Заімоўскі.** — Кармовая база ў нас вельмі слабая, а мы не правядзём мелярацыі, мы не робім з лугоў добрай сенажаці.

Дырэктар бровара т. **Понтаўскі** гаворыць аб тым, што ў раёне ўсім дзённа пастаўлена пажарная ахова, не вядзецца барацьба за добрую дарогу, санітарнае абслугоўванне вёскі — закінуты ўчастак работы. Галоўны недахоп работы РВК, — заўважае ён — гэта адсутнасць праверкі выканання сельсоветамі пастаноў райвыканкома.

М. ВІШНЕЎСКІ



Фабрыка «КІМ» Віцебск

У КАМІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ

ЦЭХІ ІНДЫВІДУАЛЬНАГА ПАШЫВУ—ЗАКІНУТЫ УЧАСТАК

Работа цэха індывідуальнага пашыву віцебскай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» пастаўлена вельмі дрэнна.

Кніга скаргаў даўно ўжо спісана. На прымерку прыходзіцца трацінь больш паўтары гадзіны ў чарэ. Замест заказанага матэрыяла даюць другі, горшы. Шмат напісана скаргаў, але-ж ніхто на іх не адказвае. Заказы ляжаць па паўтара-два месяцы.

Такое-ж становішча на магілеўскай фабрыцы імя Валадарскага.

— Цэх індывідуальнага пашыву не ўкамплектаван кваліфікаванымі швэйнікамі. За 9 месяцаў цэх выканаў план на 78,5 проц. Начальнік цэха Піндрык рэдка бывае ў цэху.

Цэх індывідуальнага пашыву гомельскай фабрыкі «Комінтэрн» выпускае вопратку па індывідуальных заказах самай нізкай якасці. Замест 20 дзён заказы ляжаць па месяцу і больш.

На прыёмных пунктах няма клапатлівых, уважлівых адносін да заказчыкаў, нама культурнай абстаноўкі (цесната, пакоі дрэнна абсталяваны, бруд, чаргі). Дырэктары швэйных фабрык мала цікавяцца работай цэхаў індывідуальных заказаў, не аказваюць ім дапамогі ў рабоце. Усю адказнасць яны ўскладзі на начальнікаў цэхаў.

Інспектар Белшвэйтрэста па індывідуальнаму пашыву тав. **Когна** за цэлы год ні разу не выязджаў на прадпрыемствы. Нам. дырэктара трэста тав. **Нэйман** пры выездзе на фабрыкі нават не заходзіў у цэхі індывідуальных заказаў.

Нядаўна ўпаўнаважаны камісіі совецкага кантроля пры СНК СССР па БССР на падпіраным пасяджэнні з удзелам дырэктароў прадпрыемстваў і кіраўнікоў заслухаў вынікі праверкі выканання гомельскай, віцебскай і магілеўскай фабрыкамі пастановы Соўнаркома СССР аб арганізацыі пашыўкі вопраткі па індывідуальных заказах.

Усе факты, прадастаўленыя грамадзкімі кантралёрамі, якія абследавалі работу гэтых цэхаў, пацвердзіліся.

Дырэктарам фабрык «Сцяг індустрыялізацыі» тав. **Калабкову**, імя Валадарскага тав. **Когану**, загадчыку цэха індывідуальных заказаў гомельскай фабрыкі «Комінтэрн» тав. **Фарбераву**, інспектару па індывідуальнаму пашыву Белшвэйтрэста тав. **Когна** і нам. дырэктара тав. **Нейману** пастаўлена на від.

Дырэктары гэтых прадпрыемстваў і кіраўніцтва Белшвэйтрэста абавязаны ў самы найкарацейшы тэрмін прыняць усе неабходныя мерапрыемствы, каб ліквідаваць адзначаныя недахопы.

ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЛІ ГАДАВЫ ПРОМФІНПЛАН

ВІЦЕБСК, 23. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Ватная фабрыка імя Крупскай 22 лістапада датэрмінова выканала промфінплан 1934 года ў натуральным відзе на 100,3 проц., і ў цэнавым — на 102,1 проц. Рабочы калектыў фабрыкі абяцае к канцу года выпусціць дадаткова прадукцыі на 874 тыс. рублёў.

Промфінплан 1934 г. таксама датэрмінова выканалі акулярная фабрыка і скурзавод. Рабочы скурзавода ўзялі на сябе абавязацельства дадаткова выпусціць прадукцыі на 152 тыс. руб.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

Фільм „Чапаеў“—перамога квітнеючай соцыялістычнай культуры



Артыст Бабачкін у ролі Чапаева.

КОНІК

Заг. аддзелам культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б.

ГЛЫБОКА ХВАЛЮЮЧЫ ФІЛЬМ

«Чапаева» не глядзіш у звычайным разуменні. Першыя-ж кадры кінокарціны захапляюць цалкам. Мыслямі, пачуццём жывеш абстаноўкай сапраўды гераічнай барацьбы за «дасканалае будучае жыццё», за якое самаахвярна з усёй рэволюцыйнай адданасцю змагаюцца легендарны партызанскі герой—камандзір Чапаеў, Фурманаў, Пецька, Анка.

Рэжысеры гэтай кінокарціны ўзнялі вобразы герояў на аграмадную ідэйную вышыню, даўшы ў іх асобе багацейшымі сродкамі мастацтва абагулены, палітычна правільны паказ рэволюцыйных сіл, іх гераічныя бітвы за перамогу новага жыцця.

Тэма грамадзянскай вайны—не новая для кінематаграфіі. На гэту тэму быў рад карцін—«Разгром», «Мяцеж», «Арсенал», «Аненкоўшчына» і інш.

У чым-жа сакрэт выключнага поспеху, культурна-палітычнага значэння «Чапаева», зробленага на гэтай-жа тэматыцы?

На гэта пытанне дае адказ сама кінокарціна. «Баявыя ночы» чапаеўцаў паказаны ў карціне зусім паново. Аўтары фільма ўніклі традыцыйнага штампу, пяжаўшага амаль на ўсіх карцінах, адлюстоўваючых узброеную барацьбу рабочага класа сялянства супроць сіл контрэволюцыі. У «Чапаеве» гэта барацьба паказана пад новым кутом гледжання. Вобразы гэтай карціны з выключнай глыбінёй і праўдзівасцю паказваюць ідэйны рост людзей рэволюцыі. Асабліва поўнакроўна, з вялікім ідэйна-мастацкім майстэрствам дан вобраз першага героя Чапаева. Нават недахопы Чапаева, як чапаевца, не толькі не змяншаюць, а, наадварот, узмацняюць уражанне, яшчэ больш выпукла рысуючы становчы тып барацьбіта, робяць яго бліжэйшым, больш зразумелым.

У асобе Фурманава ўмела, пераканаўча прадэманстравана аграмадная палітычная ўздзейнасць партыі на пераробку людзей рэволюцыі. Даволі пераканаць Чапаева ў пачатку фільма і ў канцу яго—і аграмаднейшы ўплыў партыі на гэту выключную асобу выяўляецца перад гледачом з усёй выразнасцю і вялічнасцю.

Усё гэта ўзнімае «Чапаева» на велізарную вышыню не толькі ў гапіне кінематаграфіі; «Чапаеў» на экране з'яўляецца ўзорам мастацтва, непраўзойдзенага яшчэ нават на тэатральнай сцэне. Гэты фільм узнімаецца на вышыню паказу праўды жыцця, ён прымушае зноў перажываць незабыўныя дні эпохі грамадзянскай вайны, ён праўдзіва—і таму пераканаўча—ускрывае сувязь з'яў і паказвае, як і адкуль раслі тыя цуды гераіства, якімі так багата сапраўднасць Краіны советаў,—і ў гэтым неацэнімая прыгожасць карціны.

Безумоўна, фільм «Чапаеў» павінна прагледзець уся краіна. Партыйныя арганізацыі абавязаны ўзяць на сябе функцыі прапагандыстаў гэтага выдатнага фільма і арганізаваць прагляд яго кожным рабочым, калгаснікам, селянінам, байцом Чырвонай арміі, служачым, вучнем.

А. РЫСКІН

Сакратар Менскага гаркома КП(б)Б.

КАРЦІНА ВЯЛІКАГА І МУЖНАГА МАСТАЦТВА

«Чапаеў»—карціна вялікага і мужнага мастацтва. Кожны кадр гэтага, на дзіва простага і пераканаўчага фільма эмацыянальна запальвае глядача, ён прыкоўвае яго да сябе, хвалюе яго вобразамі чапаеўскага гераізма і фурманаўскай жалезнай вытрымкі. Ён паказвае арганізуючую ролю партыі, вялікую мудрасць яе тактыкі, шляхоў, якім яна накіроўвала і вяла волю мас да перамогі.

«Чапаеў»—вось дзе незлічоная колькасць матэрыялу і фактаў для выхавання з нашай працоўнай моладзі смелых, адважных, скромных, находчывых барацьбітоў за дабро і росквіт кроўю сваіх лепшых сыноў абмытай соцыялістычнай радзімы.

Зробім усё для таго, каб «Чапаева» бачылі мільёны.

П. А. БЕЛОУ

Кавалерыйская дывізія.

ВЫСОКАМАСТАЦКІ ТВОР

Карціна «Чапаеў» робіць вельмі моцнае ўражанне, галоўным чынам, сваёй рэальнасцю. Мяне асабліва зацікавіў вобраз Чапаева. Мне здаецца, што ён паказан тут нават мацней, чым у Фурманава ў кнізе «Чапаеў».

Проста непраўзойдзеным з'яўляецца эпізод, калі Чапаеў вучыць камбрыга Еланя, «дзе павінен быць камандзір».

Мне асабліва хочацца падкрэсліць кадры «псіхалагічнай атакі», якія паказваюць наколькі моцны быў непрыяцель і наколькі цяжка давалася перамога.

Я хацеў-бы скарыстаць трыбуну газеты, каб сказаць аўтарам і рэжысерам фільма тт. Васільевым:

— Вы дасягнулі справіўся з распрацоўкай «Чапаева», вы далі кантэмпаў уклад у совецкую кінематаграфію. Гэты высокамастацкі твор адыграе, безумоўна, вялікую ролю ва ўзмацненні абароназдольнасці нашай краіны, ва ўкараненні любові да нашай соцыялістычнай радзімы.

І. АДАМОВІЧ

Н-ская дывізія.

ЯРКІ ВОБРАЗ КАМАНДЗІРА І ТАВАРЫША

Чапаеў—яркі вобраз камандзіра і таварыша. Гэта камандзір, сапраўды высунуты народнай масай, якая правільна зразумела, што праўда на баку Чырвонай арміі. Чапаеў такі самы, як і ўсе астатнія чапаеўцы, але на цэлую галаву вышэй за іх. І таму Чапаеў заўсёды там, дзе найбольш небяспечна, дзе з рызыкай для свайго ўласнага жыцця трэба ператварыць анархічныя, партызанскія атрады ў жалезнае войска пролетарскай рэволюцыі.

Ёсць чаму вучыцца ў Чапаева!

Д. ВАЛКОВІЧ—сакратар ЦК КП(б)Б

„ЧАПАЕВА“ ПАВІННЫ ПАГЛЯДЗЕЦЬ УСЕ

Фільм «Чапаеў» глядзеў я толькі адзін раз, мала, хочацца глядзець, хочацца разбудзіць, напярэдзіць заснуўшы штаб Чапаева.

«Чапаеў» глыбока хвалюе гледача. Ён дакладна перадае Чырвоную армію такой, якой яна была ў першыя гады грамадзянскай вайны. Быт, узаемаадносіны з камандным складам, нават гутаркі, асобныя выразы добра паказаны.

Былым удзельнікам грамадзянскай вайны гэта карціна аднаўляе недалёкае мінулае, кожны ўспамінае асобныя моманты з асабістага вопыта і гэта ўтвэ больш хвалюе, робіць яе блізкай і грандыёзнай.

Карціну «Чапаеў» павінны глядзець усе—гэта кавалак непраўзойдзенай гераічнай барацьбы нашай слаўнай Чырвонай арміі з ворагамі ўнутранымі і знешнімі.

Моладзь нехай вучыцца гераізму, адвазе і самаахвярнай адданасці справе Леніна-Сталіна.

ДЗЕЦІ ВАСІЛІЯ ЧАПАЕВА

Я ГАНАРУСЯ СВАІМ БАЦЬКАМ

Артыкул Александра Чапаева—слухача акадэміі механізацыі і матарызацыі

Пры ўсім жаданні я не магу перадаць усю паўнату пачуццяў, ахапіўшых мяне, калі я ўбачыў на экране карціну «Чапаеў». Гэта было не толькі хваляванне сына, убачыўшага «уваскрошчанага» бацьку, гэта была не толькі асабістая гордасць, — гэта была гордасць маладога камандзіра, комсамольца, убачыўшага ў такіх моцных і праўдзівых вобразах нашу родную Чырвоную армію эпохі грамадзянскай вайны.

«Чапаеў» — гістарычны дакумент нашай эпохі, на якім будзем выхоўвацца мы, маладыя камандзіры РСЧА.

Я добра памятаю бацьку. Я памятаю яго наезды да нас дамоў, на адпачынак. Ён ніколі не прыязджаў адзін, а заўсёды прыводзіў з сабой больш дзесятка таварышоў, якія размяшчаліся ў нас у хаце, усюды, дзе толькі можна было, — на падлозе, на сталах.

З ім заўсёды прыязджаў арыпарац Пецька. Бацька і Пецька Ісаеў ніколі не разлучаліся. Пасля смерці бацькі я, мой брат Аркадзі і сястра Клаўдзія выхоўваліся былым камандзірам атрада чапаеўцам Жыжаложнавым. А па праўдзе кажучы, час выхоўваў не толькі Жыжаложнаў, але і многія іншыя герої-чапаеўцы. Яны акружылі нас сапраўды любоўю бацькі. І шчыльная чапаеўская сям'я расла мы, прычым кожны стараўся ўспомніць і расказаць нам аб нашым бацьку што-небудзь надзвычайнае. Затаіўшы дыханне, да позняй ночы слухалі мы баявыя расказы чапаеўцаў. Мне ўспамінаецца, як былы камбрыг Аксёнаў, які летась скончыў Тімірязеўскую акадэмію, расказаў цікавы выпадак, які нас так захапіў, што мы пры мусілі Аксёнава паўтарыць яго некалькі раз.

— Адпойчы, — расказваў Аксёнаў, — трэба было навесці мост для пераправы войска. Чапаеў выклікаў інжынераў і загадаў тэрмінова пабудаваць мост. Інжынеры мяліся, мяліся і заявілі, што пабудова настолькі складаная, што можа быць закончана не раней, чым праз чатыры дні. Чапаеў разлаваўся і заявіў, што калі праз 6 гадзін мост не будзе наведзен, дык ён перастраляе ўсіх віноўнікаў. Праз 6 гадзін мост быў наведзен і войска пераправілася.

І вось у карціне, у вобразе Чапаева мне асабліва спадабалася яго рашучасць, адважнасць, бязмежная адданасць рэволюцыі, і я буду глыбока шчаслівы, калі змагу, як камандзір Чырвонай арміі, хоць-бы ў невялікай ступені перанясці якасці бацькі.

Многія чапаеўцы мне расказвалі, што бацька быў вельмі патрабоўным, што, ідучы да Чапаева з рапартам аб бліскуча выкананым баі, камандзір ведаў, што Чапаеў не столькі будзе пытаць аб перамогах, колькі лаяць за тое, што шмат параненых, за вялікі вылатак боепрыпасаў і т. д.

Калі ўспамінаеш пра бацьку, хочацца больш працаваць, больш вучыцца, каб быць дастойным сынам сваёй радзімы, за шчасце якой змагаўся і загінуў мой бацька.

М. ЛУКІНОВІЧ

Н-ская дывізія.

Я БЫЎ РАЗАМ З ІМІ НА ЭКРАНЕ

Карціна так захапляе, што адчуваеш, быццам ты сам на экране ўдзельнічаеш з чапаеўцамі.

Чапаева любіць яго дывізія, яго любіць сялянства, з якім яму прыходзіцца мець справу. Чапаеў паказвае і вучыць, як трэба бязлітасна распраўляцца з класавым ворагам, як самаахвярна і самааддана трэба адстойваць інтарэсы соцыялістычнай бацькаўшчыны.

Праф. Р. ВЫДРА

ЯК ВЫМЕРЫЦЬ ГЭТУ СІЛУ

Ітак, і я паглядзеў «Чапаева». Паглядзеў пасля таго, як ужо ва ўсіх газетах—і ў «Праўдзе» і ў іншых прачытаў поўныя захаплення водгукі, запальваючыя радкі, гарачыя артыкулы...

І што-ж?

Чапаеў жыў, Чапаеў кліча, Чапаеў перамагае. Сапраўдны -народны герой, не легендарны, а жывы, выпеставаны партыяй, жалезна-стойкім Фурманавым.

Як вымерыць гэту сілу, сілу партыі, выклікаўшай і выклікаючай да жыцця ўсё лепшае, усё найпрыгажэйшае, усё, што ірвецца да новага прытожага жыцця, аб якім Чапаеў гаворыць Неці і Анне і якое сапраўды заваявана імі і іншымі вядомымі і невядомымі героямі невабыўных 1918, 19, 20 гадоў.

Што галоўнае ў гэтай карціне? Надзвычайная праўдзівасць, перапляценне гераічнага і ухарска-анархічнага, перамога над стыхіяй жалезнай волі партыі, логікі барацьбы з заклятым ворагам, мабілізуючым усю сваю рашучасць адчаю, асуджанасці класа.

Удалы «Чапаеў»! Ён нам усім дасць добрую зарадку, і старшаму пакаленню, прымаўшаму ўдзел у грамадзянскай вайне, і нашай моладзі, якая адчуе авеянную порахам вялікую, незабыўную эпоху грамадзянскай вайны.

Чапаеў на танцы. Кадр з фільма.

Памагла братам Васільевым даць фільм, які заслужана заняў выдатнае месца ў нашай кінематаграфіі.

Гасне святло ў кінотэатры, струменіцца блакітны паток з будкі кіномеханіка, шуміць апарат за сліной у глядачоў. — і раптам з цмянага ранняга ценяў узнікае на экране ажыўленая гісторыя, суровая і гордая гісторыя нашай барацьбы і нашых перамог. Карціна палоніць глядача з першых-жа мінут, яна захапляе і хвалюе яго з кожным наступным кадрам, яна заражае яго любоўю і нянавісцю, чаканнем і страхам, лікаваннем і яраснасцю ад сцэны к сцэне.

Паглядзеў гэту карціну чапаевец Міхайлаў і піша:

— Што для нас важна ў гэтай карціне? Вось тое хваляванне, якое я перажываў, гледзячы яе, той энтузіязм, якім яна заражае, тая палітычная зарадка, якую яна дае.

Паглядзеў карціну рабочы Орлоў і піша:

— Паказаны нашы таварышы. Як паказаны. Такія простыя, мужныя і моцныя сваёй верай у соцыялізм...

Паглядзеў карціну кінарэжысер Рашаль, і ён знаходзіць, што фільм.

— напоўнен сапраўднымі вялікімі мысліцці не толькі аб грамадзянскай вайне, але і аб сённяшнім дні, аб усім нашым жыцці, аб дзівосных рэчах, якія ў нас адбываюцца.

Кіно — самае масавае з усіх мастацтваў — дазволіць мільёнам і дзесяткам мільёнаў глядачоў адчуць рэволюцыйную героіку мінулага і глыбока прасякнуцца ёю. Той, хто ўбачыць, як змагалася старшае пакаленне за перамогу рэволюцыі ў мінулым, той будзе ведаць, як трэба змагацца за яе канчатковы трыумф.

«Чапаеў» — аграмадная падзея ў гісторыі совецкага мастацтва. «Чапаеў»—вязрыма і моцна памнажае сувязь партыі з масай. Мастацкі твор высокай пробы, «Чапаеў» пераканаўча і красамоўна дэманструе арганізуючую ролю партыі, «Чапаеў» паказвае, як партыя падпараджае стыхію і рухае яе шляхамі рэволюцыі і перамог.

Апублікаваныя ўчора ў «Праўдзе» поўныя захаплення водгукі глядачоў сведчаць не толькі аб тым, што рэжысерам і артыстам совецкага кіно ўдалося стварыць выдатны твор. Справа зусім не ў апладысментах, не ў шумнай пахвале, не ў гучных выяўленнях захаплення перад аўтарамі.

У нас выхаваліся і выраслі дзесяткі дасканалых рэжысераў, многа выдатных мастакоў і тэхнікаў кінамастацтва. «Чапаеў» — не выпадковы поспех, не выпадковая ўдача. На экранах усё часцей з'яўляюцца карціны, глыбока хвалюючыя совецкага глядача. «Чапаеў» у іх раду — толькі найбольш палкі і найбольш яркі твор. Мы не сумняваемся, што следам за «Чапаевым» паследуюць новыя значныя і таленавітыя карціны. Але не ў гэтым толькі справа. Карціна «Чапаеў» перарастае ў з'яўлічна палітычнае. Масавы водгук глядачоў — сведчанне цеснага яднання працоўных са сваёй партыяй.

Вось шалёна імчыцца ўперадзе сваёй дывізіі Чапаеў у бурцы, размахваючы шаблай. Вось барабанным крокам ідуць у «псіхалагічную атаку» адборныя афіцэрскія часці, і жанчына ля кулямёта чакае зручнага моманту, каб сустрэць іх кулямётным агнём...

Кожная сцэна захватвае дух у глядача. Барацьба, перамога, паражэнне і зноў перамога, тварыцца на экране, рухаюць страсцямі ў радах цёмнай залы. Старыя байцы ўсхвалаваны ўспамінамі. Моладзь, затаўшы дыханне, сочыць, як разгортваюцца падзеі, і ўсякі раз яраснa апладыруе, калі баявы поспех вяртаецца к партызанам вылатнай дывізіі.

Партыя атрымала новы і магутны сродак класавага выхавання моладзі. Моладзь навучна бачыць ворага і мацней ненавідзіць яго. Нянавісць да ворага, злучаная з поўным запалу імкненнем перад гераічнай памяцью байцоў, найлепшых за рэволюцыю, набывае такую-ж сілу, як палкая любоў да соцыялістычнай радзімы.

Карціну паглядзіць уся краіна. Яе размножаць у сотнях копій для гукавых экранаў. Будуць створаны і нямыя варыянты, каб паказаць «Чапаева» ва ўсіх кутках абшырнай краіны—у гарадах, вёсках, калгасах, пасёлках, у казармах, у клубах і на плошчах.

Старыя байцы ўспамінаюць аб мінулым з заслужанай гордасцю. Надзвычайнымі і хвалюючымі вобразамі мінулага старыя байцы гавораць моладзі:

— Вось як мы змагаліся. Мы былі жабракі. Мы хадзілі ў затрапезным выглядзе. Нам не хапала культуры, патрэбнай, спарадаў, вынтовак. І ўсё-ж мы перамаглі, бо вялікая была наша нянавісць да ворагаў, вялікая была наша адданасць рэволюцыі і вялікая была мудрасць партыі, вялікай нас ад перамогі к перамозе.

Старыя байцы, расказваючы аб мінулым, дапамагаюць таксама ясней і шчыраней даніць сучаснае:

— Створан новы свет. Мы цяпер багаты і моцны. Непамерна выраслі наша магутнасць і наша арганізаванасць. У нас вялікая Чырвоная армія, гатовая абараніць мір вялікага соцыялістычнага будаўніцтва. І калі вораг калі-небудзь паспрабуе сунуцца да нас, соцыялістычная радзіма ўладае ў адпоў і матэрыяльнымі сродкамі і найвышэйшай маральнай сілай, каб разграміць і знішчыць ворага.

(«Правда»).

Артыст Блінаў у ролі Фурманава.

СВЯТА СОВЕЦКАГА МАСТАЦТВА

„ЧАПАЕЎ“ У 100 КОПІЯХ

На Ленінградскай кіно-капіравальнай фабрыцы цяпер напружаная работа па адрукаванню копій гукавога кіно «Чапаева». Улічваючы велізарны і зусім заслужаны поспех фільма, фабрыка выпускае яго ў 100 копіях. Гэта—небывалы і першы ў совецкай практыцы выпадак выпуску гукавога фільма ў такой велізарнай колькасці экземпляраў. Апрача таго, па патрабаванню ваенных арганізацый, для дамоў Чырвонай арміі будзе надрукавана яшчэ 40 экземпляраў.

РСФСР атрымлівае 65 экземпляраў «Чапаева», Украіна—18, Дальбас, Беларусь, Грузія, Азербайджан і Узбекістан па 2 экз., Армянія, Туркменістан і Таджыкістан—па 1.

НЯМЫ ВАРЫЯНТ „ЧАПАЕВА“

Ленінградская кіно-фабрыка ў бліжэйшыя часы прыступае да тэрміновага выпуску нямога варыянта карціны «Чапаеў». У нямы варыянт «Чапаева» рэжысерамі С. і Г. Васільевымі часткова будуць уключаны некаторыя цікавейшыя эпізоды з жыцця легендарнага героя Чырвонай арміі - В. І. Чапаева і баявых аперацый яго дывізіі, якія не маглі ўвайсці ў нармальны метраж гукавога—асноўнага варыянта карціны.

У МАСКВЕ ПРЫБЫЛА КЛАЎДЗІЯ ЧАПАЕВА

У Маскву прыбыла Клаўдзія Чапаева—дачка легендарнага героя Чапаева.

23 лістапада сям'я Чапаевых — старшы сын Александр, Аркадзі і дачка Клаўдзія наведалі тэатр МОСПС і глядзелі пастаноўку «Чапаеў».

Акторы, якія прымаюць удзел у пастаноўцы, у антракце прыязна з сям'ёй Чапаевых таварыскую гутарку.

С. С. СВІСТУНОЎ

Качагар Эльвода.

БЫЦЬ ТАКІМ, ЯК ЧАПАЕЎ

Незгладзімае ўражанне застаецца пасля прагляду найлепшага з бачаных мною фільмаў—«Чапаева». Перад вачыма паўстала грамадзянская вайна, у якой я прымаў актыўны ўдзел. Асаблівае ўражанне зрабіў на мяне герой Чапаеў, які, не лічачыся ні з чым, у самыя цяжкія хвіліны, рызыкуючы сваім жыццём, расстрэльваў з кулямётаў наступаючых ворагаў. Фільм «Чапаеў» надоўга застанецца ў маёй памяці. Так і хочацца быць такім, як Чапаеў.

Андрэй Александровіч

ТЫ БУДЗЕШ ЖЫЦЬ ЭПОХА

Глядзеў я ўчора дзіўны фільм «Чапаеў».

Ажыўлены экран... Ты пільна вока жмурыш,
А там, як з цемен, рассейваючы дым,
Ідуць, гудуць, насоўваюцца бурай —
Уздыбленыя людзі і гады.
Ідуць, гудуць чапаеўскай крывёю,
І я з гранатаю на полі барацьбы...
І ты не высядзіш, ты рвешся ў рокат бою,
Ой, ты не высядзіш, ты прагнеш з імі быць!
Вакол мяне, я знаю, шмат народу,
А што мне зал, з жонай цішыні —
Я вырваўся, крышу я перашкоды,
Лячу ў атаку я на ўзмыленым кані!
Як пад нагамі жвір, так ненавісць скрыгоча,
І гнеў, як выбух, вырвецца з грудзей —
І я крышу бандытам чорнай ночы:
— Праклянце вам, майстры крывавых дзей!
Быў я стрыножаны трывогай і спалохам,
Застаўся — ўзброены ўрачыстасцю вясны.
Не вырваць з памяці, ты будзеш жыць — эпоха,
Эпоха грамадзянскае вайны!

26 лістапада 1934 г.

За рубяжом

ФРАНЦУЗСКАЯ ГАЗЕТА АБ ДАСЯГНЕННЯХ СОВЕЦКАЙ АВІЯЦЫІ

ПАРЫЖ, 25 лістапада. (БЕЛТА). У артыкуле аб совецкім аддзеле на міжнародная авіяцыйнай выстаўцы ў Парыжы «Тан» піша: «Рэзультаты, дасягнутыя СССР у галіне авіяцыі, выдатны і заслугоўваюць увагі».

Газета асоба адзначае: «Выключна цікавае прымяненне авіяцыі ў сельскай гаспадарцы, у барацьбе з малярыяй, у лясной гаспадарцы і т. д.».

Аніслаючы самалёт т. Мержаева і гандолу совенкага стратастата, газета напамінае аб эпапеі чэлюскінтаў.

Далей «Тан» спыняецца на дасягненнях совецкага парашутызма, планерызма і дае рад вестак аб самалёце-гіганце «Максим Горький» і аб рабоце Асоавіяхіма.

«Спецыялісты,—гаворыць «Тан»,— звярнулі ўвагу на экспанаты інстытута Цагі. Наогул для многіх наведвальнікаў выстаўкі совецкі аддзел быў сапраўдным адкрыццём. Але кіраўнік СССР яшчэ не поўнасцю задаволены дасягнутымі вынікамі і прадаўжаюць працаваць над удасканальваннем павету ранага флота».

«Тан» змяшчае цытаты з прамовы т. Варашылава на XVII з'ездзе партыі і заключае:

«Нарком абароны, як відаць, усім аб'ектыўна асвятліў становішча совецкай авіяцыі. Пасля наведвання выстаўкі пад словамі Варашылава можна толькі падпісацца».

У Н'ю-Ёрку спынілася эвбастоўка маракоў, сарваная здрадніцкімі адносінамі прафсаюзных правадыроў з прадпрыемцамі.

НА ЗДЫМКУ: Бастуючыя ў сталоўцы, арганізаванай Міжрабпомам. На сцяне плакат: «Сталовая Міжрабпома для беспрацоўных»

ПІСЬМО тав. ЛІТВІНАВА І ТЭФФІК РЮШЦЮ-БЕЯ АВЕНОЛЮ

ЖЭНЕВА, 25 лістапада. (БЕЛТА). Сёння за подпісамі т. Літвінава і турецкага міністра замежных спраў Тэффік Рушцю-бея генеральнаму сакратару Лігі нацый Авенолю адасавана пісьмо, якое ўказвае на ненармальнасць такога становішча, калі раней вызначаныя даты пасяджэння совета Лігі мяняецца і пераносіцца без ведама і згоды ўсіх членаў совета, чым стварацца вялікія няручнасці для апошніх і, у асаблівасці, для тых, хто прыязджае з больш аддаленых краін. Тав. Літвінаў і Тэффік Рушцю-бей настойваюць на тым, каб наперад падобныя змены адбываліся не менш чым за 5 дзён да раней вызначанага тэрміну. У выпадку, калі несаблюдзенне 5-дзённага тэрміну выклікаецца якой-небудзь неабходнасцю, змены ў датах павінны вытварацца па адпадушнаму рашэнню членаў совета.

СЕСІЯ СОВЕТА ЛІГІ НАЦЫЙ АДКЛАДВАЕЦЦА

ЖЭНЕВА, 25 лістапада. (БЕЛТА). Афіцыяльна паведамляецца, што сесія Совета Лігі нацый збярэцца не раней 3 снежня.

ПЕСІМІСТЫЧНАЯ ПРАМОВА ГЕБЕЛЬСА
ПАТРАБАВАННЕ ДАЛЕЙШЫХ АХВЯР АД УСІХ СЛАЁУ НАСЕЛЬНІЦТВА

БЕРЛІН, 24 лістапада. (БЕЛТА). Учора на сходзе актывістаў берлінскай арганізацыі нацыянал-соцыялістскай партыі выступіў Гебельс. Супроць звычаю, прамова яго не вызначалася аптымізмам: Гаворачы аб неабходнасці для ўрада трэбаваць далейшых ахвяр ад усіх слаёў насельніцтва, Гебельс адкрыта заявіў, што «ўрад не мае ніякіх ілюзій адносна цяжкасці і працяжнасці гэтых ахвяр. «Урад,—падкрэсліў Гебельс,—павінен мець мужнасць быць непапулярным».

«Пакуль лёс нацыі вісіць на валаску, ніякая крытыка недапушчальна,—сказаў Гебельс.—Члены партыі павінны працаваць. Астацца павінны быць шчаслівы, што наогул яшчэ існуюць. Не хапала толькі, каб тыя, хто жыве па нашай мясцы, асмеліліся нас яшчэ крытыкаваць!».

Нарэшце, трэба адзначыць заяву Гебельса, што ўрад гатоў рабіць усё, каб прымірыцца з Францыяй, і паступныя за гэтым словы: «Мы не бачым зпінаці, працуючы для міру, рабіць уступкі. Мы не хочам толькі, каб мы адны рабілі гэтыя ўступкі».

ЭПІДЭМІЯ ДЫФТЭРЫІ Ў ГЕРМАНІІ

БЕРЛІН, 26.XI. (БЕЛТА). Услед за Прусіяй, аб распаўсюджанні эпідэміі дыфтэрыі паведамляюць з паўднёвай Германіі. У акрузе Балетштэдт (Гарыская вобласць) усюды забаронены ўсе публічныя сходы. У гарадах Ангэрлобэн, у Квеплінбургу (Саксонія) і Талле (Тюрынгія) зачыны ўсе навучальныя ўстановы. Таксама аб закрыцці школ, з мэтай уніжнуць распаўсюджання эпідэміі паведамляюць з округ Вормса і Альтэа (Франконія), дзе зарэгістравана ўжо некалькі смяротных выпадкаў.

Адначасова спынены заняткі ў школах у горадзе Брануэсбергу і радзе вёсак раёна Аленштэйн (усходняя Прусія) з крычыны эпідэміі крупа.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

Па паведамленнях Гавас з Іспаніі, лік палітычных зняволеных у адным толькі Овіедо перавышае тры тысячы.

Вялікі нацыянальны сход Турцыі прадоўжыў на паўгода тэрмін дзейнасці совецка-турэцкай пагранічнай канвенцыі.

Совецкі паверанны ў справах Розенберг даў абед у ёнар французскага міністра гандлю Маршандо, які ў пачатку снежня прыедзе ў Маскву.

Паміж балівійскімі і парагвайскімі войскамі прадаўжаюцца жорсткія баі ў Чако. Па паведамленню парагвайскіх крыніц, у час учарашняй бойкі парагвайскімі войскамі захоплен яшчэ адзін порт. Балівійскія войскі адступаюць.

Больш 500 дэлегатаў ад профсаюзаў і іншых грамадскіх арганізацый Нью-Іорка, ўдзельнікаў мясцовага кангрэса супроць пагрозы вайны і фашызма, вынеслі рэзалюцыю пратэсту супроць фашысцкага тэрора ў Іспаніі.

Па паведамленню агенцтва Стэфані, турэцкі суд Італіі пастанавіў адмовіць у хадайніцтве Францыі аб выдачы Павеліча і Кватэрніка, якім прад'яўляецца абвінавачанне ў арганізацыі марсельскіх забойстваў.

КУРОРТ У БАБРУЙСКУ

Каля Бабруйска на беразе ракі Бярэзіна вядуцца работы па пабудове першага ў БССР бальнеалагічнага курорта для лячэння рэўматызма, парушэнняў абмену матэрый і т. д. Шчаткаўскі ўчастак адведзен для будаўніцтва курортных будынкаў і бурэння другой скважыны салёнай вады глыбінёй да 350 метраў.

Заканчваюцца палявыя работы, якія вядуцца геалагічнай партыяй пад кіраўніцтвам акадэміка Блюдуха. Адна крыніца мінеральных вод, даючая да 800 вёдраў вады, ужо эксплаатуецца. Арганізавана лячэбніца на 25 ложкаў. Бабруйская крыніца па складу сваёй вады — 16 грам солей на адзін літр вады, падобна да крыніц курорта Старая Руса.

Наяўнасць крыніц салёнай вады, спрыяючага клімата адкрывае вялікія перспектывы для будучага курорта.

СЛЕСАР КАЗЛОЎ—ВЫДАТНЫ ПЛАНЕРЫСТ

МАГІЛЕЎ. На шаўковай фабрыцы арганізавана школа планерыстаў. Ёсць свой улясны планер. Нядаўна адбыўся выпуск школы планерыстаў. Слесар Казлоў здаў экзамен на «выдатна». Тав. Казлоў ужо зрабіў 28 палётаў на планеры. Зараз ён паступае ў школу планерыстаў-інструктароў.

(БЕЛТА).

Менская соўпартшкола уносіць на пабудову агітзвяна імя III ўсебеларускага з'езда рабселькораў 435 руб.

***

Рэдкалегія інспенгазеты курсаў марксізма-ленінізма пры ЦК КП(б)Б уносіць на пабудову агітзвяна 400 руб. Збор сродкаў прадаўжаецца.

БЯРКОЎСКІ.

***

Селькор з калгаса «Звязда» (Крупскі раён) тав. Намоска сабраў сярод сваіх калгаснікаў на пабудову агітзвяна 40 руб.

ІВАШЫН.

***

Соўгас імя Свердлова, Дзяржынскага раёна, уносіць на пабудову агітзвяна 340 руб. Збор прадаўжаецца.

БЯЗМЕН П.

***

Грэская поўная сярэдняя школа, Слуцкага раёна, уносіць на пабудову агітзвяна 300 руб. Збор сродкаў прадаўжаецца.

В. МАЕВЫ.

МЕНСК

САНІТАРНЫ ПАХОД НА ФАБРЫЦЫ «ОКЦЯБР»

Ячэйка таварыства Чырвонага крыжа на швейнай фабрыцы «Окцябр» арганізавала санітарны паход. У двух цэхах абследавана якасць уборкі, праведзена нарада прыбіральшчыц, арганізавана некалькі дакладаў аб уплыве чыстаты ў цэху на прадукцыйнасць працы.

Апрача таго абследаваны 398 кватэр рабочых і работніц.

* ЭКСКУРСІІ ПА МАРШРУТУ МАСКВА—ЛЕНІНГРАД — КІЕЎ — ДНЕПРАДЭС будуць арганізаваны ў часе зімовых канікул таварыствам пролетарскага турызма. У экскурсіі намечана пасланць 300 студэнтаў.

* 12 РАБОЧЫХ паліграфічнай прамысловасці выехалі 25 лістапада ў Маскву для азнаямлення з работай буйнейшых паліграфічных прадпрыемстваў.

* ДЗІЦЯЧАЯ СПАРТЫЎНАЯ ШКОЛА з гімнастычным, лыжным, канькабежным і хакейным аддзяленнямі адкрываецца ў снежні. Заняткі ў школе будуць праходзіць без адрыву ад вучобы.

* 63 ЯСЛІ будуць працаваць на працягу зімы ў калгасах і соўгасах раёна. Праўленням калгасаў прапанавана забяспечыць яслі добра адрамантаванымі і абсталяванымі памяшканнямі.

* ТВОРЧЫЯ ВЕЧАРЫ ПАЭТАЎ АЛЕКСАНДРОВІЧА І ХАРЫКА будуць наладжаны ў снежні-студзені ў Маскве і Кіеве. Даклад аб творчасці Александровіча зробіць тав. Клімковіч.

АМБУЛАТОРНАЯ ДАПАМОГА НА САМАЛЁТАХ

Вопыт аказання экстранай медыцынскай дапамогі на самалётах у Беларусі поўнасцю сябе апраўдаў. Наркамат аховы здароўя БССР распрацоўвае зараз пытанне аб арганізацыі абмузаторнай дапамогі на самалётах. Прафесары-кансультанты, высока кваліфікаваныя дактары будуць сістэматычна вылятаць у аддаленыя раёны рэспублікі для амбулаторнага прыёму хворых.

* ПЕРАЦ МАРКІШ — радомы яўрэйскі совецкі пісьменнік прыехаў у Менск.

* УСЕБЕЛАРУСКАЯ САНІТАРНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ закончыла сваю работу. На заключных пасяджэннях выступілі нарком аховы здароўя БССР тав. Сурта, прадстаўнікі Галоўнай санітарнай інспекцыі Саюза праф. Дабрэйцар і тав. Ліхачоў і начальнік санітарнага кіраўніцтва Беларускай ваеннай акругі тав. Худніцкі. Канферэнцыя ўключылася ў конкурс на лепшы раён па пастаноўцы санітарнай работы.

* ПАЧАЎСЯ ЗАВОЗ ТАВАРАЎ для магазіна «Гастраном», які адкрываецца ў бліжэйшы час у Менску. Зварот магазіна вызначан у 1 млн.—1.200 тыс. руб. у месяц. Для дапамогі ў арганізацыі магазіна прыехала брыгада Наркамата ўнутранага гандлю Саюза на чале з дырэктарам ленінградскага «Гастранома» тав. Дончаком.

* ГАБІНЕТ ЛІТАРАТУРЫ І МОВАЗНАЎСТВА адкрываецца пры Вышэйшым беларускім педагагічным інстытуце. Сёння ў інстытуце адкрываецца канферэнцыя па пытаннях методыкі выкладання.

* ШКОЛЬНЫЯ ГАРАДСКІЯ СЕКЦЫІ ПА КАНЬКАХ І ЛЫЖАХ арганізаваны і прыступілі да працы пры Менскім совеце фізкультуры. Менскім гарэла. Канькабежнай секцыяй кіруе майстар па канках тав. Галавеч.

* БЕЛСОВЕТ ОПТЭ СУМЕСНА З КУЛЬТСЕКТАРАМ ЦСПСБ праводзіць к XI з'езду совецкіх ты экскурсіі лепшых ударнікаў прадпрыемстваў Менска на БелДРЭС. Мэта экскурсіі—азнаямленне з работай станцыі і абмен вытворчым вопытам. У складзе кожнай экскурсіі 10 чалавек.

ПАПРАЎКА

У пастанове Менгаркома КП(б)Б аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі, змешчанай ва учарашнім нумары «Звязды» па віне стылярэдактуры скажон адзін з пунктаў. Трэба чытаць: «Сакратару парткома электрастанцыі т. Кур'яну і старшыні МК т. Каханоўскаму абвясціць суровую вымову з папярэджаннем і зняць іх з работы».

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

ПАСТАНОВА
Народнага Камісарыята ўнутранага гандлю БССР

25 лістапада 1934 г. г. Менск.

Наркомунутгандаль БССР прапануе ўсім прадстаўніцтвам усесаюзных гандлёвых арганізацый, філіялам і канторам усесаюзных гандлёвых арганізацый, прадстаўніцтвам і канторам саюзных рэспублік, краёў і абласцей—абавязкова **не позней 3 снежня 1934 года ЗАРЭГІСТРАВАЦЦА ў Наркомунутгандлю БССР** (аддзел арганізацыі гандлёвай сеткі, пакой № 407, у тав. Камянецкага).

У выпадку выкрыцця прадстаўніцтва, або кантор па-зарэспубліканскіх, не зарэгістраваных у Наркомунутгандлі БССР, кіраўнікі гэтакіх **будуць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.**

Народны Камісар Унутранага Гандлю БССР Н. Гурэвіч.

Справаздачны сход
по выбарах у горсовет грамадзян (утрыманцаў рабочых і служачых),

не працуючых, маючых права голасу, пражываючых у домах прыватных домаўладальнікаў па вуліцах: Каменная, Уфімская, Нова-Уфімская, Іонінская, Красная, Красівы завулак, Лібаўская, 2-я Лібаўская, Выхаўская, Новая вуліца, Сенніцкая, Сняпны завулак, Асоавіяхімаўская, Дзерадромаўская, Каапераціўны завулак, 1-шы Чыгуначны зав., 2-гі Чыгуначны завулак, 3-ці, 4-ты, 5-ты Чыгуначныя завулкі, Чыгуначная, Суражская, 1-ая Сяргеяўская, 1-я Свярдлоўская, Ленінградская, Совецкая, Маскоўская, Затурмны зав., вул. Берсона, Бухарына, Гайцеса, 11-га ліпеня, Ульянаўская, Беласнежны зав., Біркая, Грушаўская, Кармазы зав., Пасыпаўская, Тыфлісная, Студзёнская, Самарская, Койданаўскі тракт, Брылеўская вул., Брылеўскія завулкі,—размешчаныя у 3-м раёне міліцыі,

адбудзецца

СЁННЯ, 27 ЛІСТАПАДА у 2 гадзіны дня

ў памяшканні клуба металістаў (Універсітэцкая 12).

У час сходу арганізаваны дзіцячы пакой і дзіцячыя яслі.

Менская гарадская выбарчая камісія.

ГОРСПАЖЫЎСАЮЗ Кір. грамадск. харч. АДКРЫЎ па Ленінскай вул. д. № 28, радам з поштай

НОВУЮ КАФЕЙНУЮ

У БУФЕЦЕ ВЯЛІКІ ВЫБАР ГАРАЧЫХ І ХАЛОДНЫХ ЗАКУСАК

ЦЭНЫ АГУЛЬНАДАСТУПНЫЯ.

КАФЕЙНАЯ адкрыта з 8 гадз. раніцы да 12 гадз. ночы.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" — Гукавы мастацкі фільм ПЕСНЯ аб ШЧАСЦІ. Замест праграмы — КАНЦЭРТ

Гукавы кіно-тэатр — Гукавы мастацкі фільм ЧАПАЕЎ

Кіно „Інтэрнацыянал" — Гукавы мастацкі фільм БЛУКАЮЧЫЯ ЗОРКІ

Кіно „СПАРТАК" — Новы замежны фільм За гонар брата

Сёння, 27 лістапада ў 8 г. веч. ў актавай залі (б. політэхнічны інстытут) адбудзецца

адкрытае пасяджэнне кафедры гісторыі СССР

Вышэйшага педінстытута з дакладам праф. В. Н. Бачкарова (Масква) на тэму:

„Аб некаторых пытаннях з гісторыі рускага феадалізма".

Запрашаюцца выкладчыкі школ па гісторыі.

Таварыства „ПРЫХІЛЬНІК ДЗЯЦЕЙ"

у мэтах выдання кнігі-зборніка аб дзіцячых дамах Беларусі прошіць усіх б. выхавальнікаў дзіцячых дамоў і б. беспрытульных, якія знаходзяцца ў Менску

з'явіцца на **нараду**

30 лістапада, у 7 гадз. вечара, у памяшканні канторы (Совецкая 40).

Пераемства запрашаюцца наступныя таварышы: Шчэрбакоў А. (6 полк), Дарожны С. (Дом пісьменнікаў), Дабрэвольскі („Чырв. змена"), Раманоўская (Дзярж. бібліятэка), Ліўшыц (Дом пісьменніка), ад саюза пісьменнікаў, гарком ЛКСМБ, Наркомасветы т. Лаўрановіч і ад „Чырв. змены".

Менгарсовет таварыства „Прыхільнік дзяцей".

МЕНСКІ ГІДРАТЭХНІКУМ

паведамляе студэнтам, што заняткі на ўсіх курсах нармальна пачнуцца 3 снежня г. г.

К паказанаму тэрміну з'явіцца без спазнення на адрасу: Менск, Пляц Волі, д. № 4.

Дырэктар Гідратэхнікума ЛУКЯНСКІ

Кіраўніцтва цырковымі, эстрадным і музычным прадпрыемствамі пры Наркомасветы БССР „ЦЭБ" даводзіць да ведама ўсіх зацікаўленых устаноў, арганізацый і асоб што пастановай СНК БССР ад 16.XI-1934 г. яму надана

выключнае права стацыянарнага абслугоўвання ўсіх плацсвят, клубаў, тэатраў, летніх садоў, паркаў, і т. д. на тэрыторыі БССР, забараняючы ўсім іншым арганізацыям займацца гэтай работай.

Кіраўніцтва ЦЭБ: Менск, клуб Імя III з'езда профсаюзаў, тэл № 27-5.

Упаўнаважаныя—у г.г. Гомелі, Віцебску, Оршы, Бабруйску.

ШУКАЮ 1—2 пакоі у любым раёне горада. Згодзен на рамонт і іншыя выдаткі.

Звяніць па тэлефону 21—360.

ПЛАН ВЫБАРЧЫХ СХОДАЎ
менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвоناармейскіх дэпутатаў на 28 лістапада

№ № выб. участкаў	Выбарчы ўчастак і назва прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.	Лік выбарщ.	Час сходу	Месца сходу	Упаўнаважаны
36	Беларускае кір-ва сувязі. Інфармацыйна-даведачная к-ра. НР № 1, майстэрня БУС, чыгуначна-паштовае аддзяленне, ЦК сувязі	440	19 гадз.	Клуб сувязі	Янаўскі
37	Завод „Варашылава"	940	11 „	Кіно „Чырв. Зорка"	Хацкевіч
38	Паравозное дэпо: цэхі—слясарны, кацельны, падсобны, вугальны склад, цэх сілавых токаў, частка праваднікоў	620	17 „	Клуб „Ільіча" (таварн.)	Кудзелька
39	Белгандаль, Менгандаль, Белхарчгандаль, Менхарчгандаль, школа Белхарчгандля, Спецснаб Белхарчгандля і Менхарчгандля транспарт	810	19 „	Клуб імя VII з'езда профсаюзаў	Сафіян
40	Цэнтральныя майстэрні Белпромбудтрэста і Менбуда, ЗРК будаўнікоў	358	19 „	Сталовая майстэрні Белпромбудтрэста	Нейштадт
41	Завод імя Мясікова	1160	16 „	Сталовая завода	Валодзька
42	Мединстытут (навуковыя, адміністрацыйна-тэхнічныя работнікі і студэнты 1-га курса)	—	20 „	Актавая зала БДУ	Гельфанд
43	Арцелі Менлесдраўхімсаюза: арцель „Дрэнаапрацоўшчык", „Уперад", „16 МЮД", „Метраінструмент", апарат квапляе промсаюза	550	19 „	Клуб друкароў	Юдзін
44	БелТА, рэдакцыі газет «Октябрь», „Рабочий", „Юнгер Арбейтэр", „Чырв. змена", „Калгаснік Беларусі", работнікі гаркома пісьменнікаў	304	16 „	Клуб гарбароў	Александровіч
45	Вулканізацыйная майстэрня Аўтарамснаба, Менаўтарамонтная станцыя, аўтадарашкола шофераў, Дылероўская станцыя	356	19 „	Дом тэхнікі (Комсамольская, 25)	Адам
46	Паравозное дэпо (праваднікі, водаснабжэнне)	—	12 „	Ленкуток паравозн. дэпо	Кудзелька
47	Пабудком № 72—малярбуд, пабудком № 12—сантэхбуд, пабудова завода „Большэвік"	300	19 „	Клуб будаўнікоў	Грынкевіч
48	Шчацінная фабрыка	245	16 „	На фабрыцы	Амбражунас
49	Малочны завод, Заготжывёла, Белмясатрэст, Белплодагародніна, Пітушкапрадукт, Маслапром, ЦП мясакансерв., Белмасламаргарынтрэст	487	18 „	Клуб імя „Леніна" (пасаж.)	Крэйнін.

ПЛАН СПРАВАЗДАЧНЫХ СХОДАЎ
менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвоناармейскіх дэпутатаў на 28 лістапада

№ выб. участка	Выбарчы ўчастак (назва прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый)	Лік выбарщ.	Час правядзення сходу	Месца сходу	Дакладчык
138	Групком жыллаперацыі (горжылсавета, работнікі жактаў)	493	19 гадз.	Клуб медработнікаў	Шчыцько
139	Групком работнікаў пажарнай аховы і добраахвотнай пажарнай аховы	256	20 „	Чырвоны куток 1-га адз. пажарнай аховы	Позняк
140	Менводканалтрэст, Наркамгас, Белэнергатрэст, Белкомунснаб, ЦП саюза комунальнікаў	270	19 „	Клуб Эльвода	Баранецкі
141	Мясцпромкомбінат № 2 Белдзяржпраекта	174	19 „	Памяшкан. Белдзяржпр.	Каган
142	Арцелі: „Чырвоны металіст", „Точная механіка", „Бел роменабгандаль", „Белметалпромсаюз"	246	19 „	Клуб „Чырв. абутнік"	Чхарчгандаль) Гурэвіч
143	Цагельны завод № 1 і ўтрыманцы рабочых завода	272	17 „	Клуб цаг. завода № 1	(нарсуд) Пучкін
144	Завод ланцугоў Галя	317	16 „	Ленкуток завода	Сакалінскі
145	Архітэктурна-будаўнічы тэхнікум (навуковыя, адм. тэхн. работнікі і студэнты)	590	20 „	Архітэктурна-будаўн. тэхнікум	Верба
146	Утрыманцы па жактах № 61 і Грушаўскага пасёлка	300	18 „	Клуб глуханямых	Гінзбург (Цэн. Чырв. Кр.)
147	Утрыманцы па жактах №№ 18, 19, 20 і 52 ЖБКТ „Дзержбанкрэст", і жакт ГТР	500	18 „	Клуб 13-годдзя	Астроўскі
148	Утрыманцы па жактах №№ 16, 17, 21, 22, 23, ЖБКТ „Іскра" і ЖБКТ „Асветнік", „Комунар"	480	18 „	Клуб металістаў	Сулькіна
149	Неарганізаванае насельніцтва (утрыманцы), праж. у раёне 4-га аддзялення міліцыі	—	14 „	Лур. тэатр	Салдаценка

Менскае аддзяленне Белдзяржтранса ПРЫСТУПІЛА

да перавозкі грузаў

у Астрашынскі Гарадок, у Лагойск, Смілавічы, Чэрвень і Бярэзіна.

Просьба да ўсіх арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў гор. Менска і раёнаў, маючых патрэбу ў транспартных сродках для перакідкі грузу ў паказаныя пункты, звяртацца ў эксплаатацыйны аддзел Менскага аддзялення БЕЛДЗЯРЖТРАНСА, Мас оўская, 3.

Партком, заўком, кясцком і калектыў друкарні і рэдакцыі „Звязда" выказвае сваё глыбокае спачуванне т. Н. М. ЛЕНЦНЕРУ з прычыны раптоўнай смерці ягО БАЦЬКІ.

ГОРСПАЖЫЎСАЮЗ (был. МГРК)

З 26 лістапада па Ленінскай вул., дом № 17,

АДКРЫТ

ПАСЛЯ КАПІТАЛЬНАГА РАМОНТУ

УЗОРНЫ УНІВЕРМАГ

ПАСТУПІЎ ВЯЛІКІ ВЫБАР

ГАТОВАГА АДЗЕННЯ, МАНУФАКТУРЫ, ГАЛАНТАРЭІ, ТРЫКАТАЖА, ГАЛОШ і іншых ТАВАРАЎ.

У спецыялізаваным магазіне Горспажыўсаюза № 93 (Ленінская, 13).

ГАСТУПІЎ У ПРОДАЖ ВЯЛІКІ АСАРТЫМЕНТ дэмісезоннага і зімовага гатовага адзення.

Атрыманы і паступілі ў продаж за ўзорным плодагародным магазіне Горспажыўсаюза (ЛЕНІНСКАЯ, 1) пабуднёвыя фрукты, розныя сухафрукты, кампот і натуральны мёд.

ЁСЦЬ ВЯЛІКІ ВЫБАР ВІН.

З 28 лістапада па Ленінскай, 4 АДКРЫТ УЗОРНЫ МАГАЗІН прахладжальных напіткаў.

ГОРСПАЖЫЎСАЮЗ.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы—ДОДЗІН ст. карэктар—БЯРОЗАВІК, ст.метранпаж—Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр—КАГАН Е., ст. друкар—АНУЧЫН. Ул. Галоўлітбела № К—6304.